ХІХ 2-4 79

ПРАЛЕТАРЫ УСІХ КРАІН, ЗЛУЧАЙЦЕСЯ!

# Літаратура і мастацтва

28 сьнежня 1932 г.
г. Менск
Цана асобнага нумару 5 кап.

Орган арганізацыйнага камітэту саюзу савецкіх пісьменьнікаў і Галоўмастацтва БССР

Дзяржаўная бібліятэка ... № 25 ... В. І. Леніна

## Прывітаньне тав. Сталіна работнікам і байцам АДПУ

**Прывітаньне работнікам і байцам АДПУ, як'я сумленна і мужна выконваюць свой абавязак перад рабочай клясай і сялянствам Савецкага Саюзу. Жадаю ім посьпехаў ў складанай справе выкараненьня ворагаў дыктатуры пралетарыяту.**
**Няхай жыве АДПУ—абнажоны меч рабочай клясы!**

**І. СТАЛІН.**

## Чарговыя задачы

Савецкая краіна стаіць напярэдадні ўступленьня ў другую пяцігодку, якая зьяўляецца пяцігодкай пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Задачы ліквідацыі капіталістычных клясаў, перамаганьня перажыткаў капіталізму ў эканоміцы і сьвядомасьці працоўных і ператварэньня ўсяго працоўнага насельніцтва ў сьвядомых будаўнікоў бясклясавага грамадзтва патрабуюць далейшага рашучага ўздыму ідэёва-мастацкага ўзроўню тэатральнае творчасьці.

Пастановы ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый стымулявалі рост тэатральнага мастацтва і савецкае драматургіі. Саюзная драматургія выступіла да XV-цігодзьдзя Кастрычніцкае рэвалюцыі з новымі работамі, як «Разгром» Фадзеева, «Мой друг» Пагодзіна, «Зямля і неба», Тур «Мстислав Удалой», «Снег», «Замежная калегія» і інш.

Беларуская савецкая драматургія дала за апошні час таксама новыя творы: «Вайна да пераможнага канца»—Коласа, «Контратака»—Курдзіна, «Новы горад»,—Гурскага, «На варце» —Сташэўскага, «Ратуй божа»—камэдыя Кобеца і Вольнага, «Рот фронт» Мікуліча. Асаблівае месца ў нашай драматургіі займае эпопея «Бацькаўшчына» Кузьмы Чорнага, якая зьяўляецца буйным палатном, дзе ставяцца вялікай філёзофска-гістарычнай значымасьці праблемы ўласнасьці і бацькаўшчыны, праз поўнакроўныя мастацкія вобразы на канкрэтна-гістарычным матар'яле дарэвалюцыйнай, а часткова і пасьлярэвалюцыйнай Беларусі.

«Бацькаўшчына», «Кармэн» таксама асабліва выпукла выявілі рост нашых акторскіх і рэжысэрскіх кадраў за апошні час. Дасягненьні нашага тэамастацтва стварылі магчымасьці для новага ўздыму тэатральнай творчасьці. Вялізарную ролю ў выкананьні новых задач, якія пастаўлены перад тэатральным мастацтвам, як зброяй выхаваньня шырокіх мас, новай абстаноўкай, як і раней, будзе адыгрываць драматургія.

Гаворачы пра значэньне п'есы, тэатру ў нашым мастацтве, т. Кірпонік на пленуме Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў казаў: «Калі мы гаворым пра выхаваўчую ролю савецкай літаратуры, мы павінны ўспомніць тыя словы, якія былі сказаны адносна вялізарнага значэньня п'есы, тэатру для нашага мастацтва. У сапраўднасьці тэатр—самае дэмакратычнае, самае даступнае масам мастацтва. І сапраўды, п'есе дайсьці да гледача, закрануць яго, усхваляваць, пакінуць нейкі пэўны перавыхавальны сьлед—значна лягчэй, чым раману. Калі раманы чытаюць дзесяткі, сотні тысяч, дык п'еса даходзіць праз разгорнутую сетку тэатраў, праз клюбы да соцен тысяч і мільёнаў».

Пленум Аргкамітэту Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў БССР, які хутка адбудзецца, павінен паставіць пытаньні разьвіцьця драматургіі ва ўсю шырыню і глыбіню, мабілізуючы лепшыя кадры празаікаў і паэтаў на стварэньне драматургічных твораў, вартых нашай эпохі.

Неабходна большая актывізацыя ў гэтай справе і Белдрамтаварыства.

Неабходна разгарнуць барацьбу за стыль сацыялістычнага рэалізму і рэвалюцыйнага рамантызму ў драматургічнай творчасьці, супроць жанравай абмежаванасьці, супроць уплываў вялікадзяржаўнага шавінізму і мясцовага нацыяналізму, за бальшавіцкую ідэёвасьць і высокі філёзофскі ўзровень драматургічных твораў.

Вельмі важнае значэньне набывае падрыхтоўка новага арыгінальнага рэпэртуару для тэатру музычнай драмы, які адчыняецца, згодна пастановы пленуму ЦК КП(б)Б, у 1933-м годзе, са студый оперы і балету і для рэарганізуемага тэатру музычнай камэдыі, які згодна пастановы ЦК ператвараецца ў беларускі тэатр музкамэдыі. Напісаньне новых опэр і музкамэдый упіраецца ў супольную работу высокакваліфікаваных драматургаў, лібрэтыстаў з кампазытарамі.

Белдрамтаварыства павінен на гэтую работу паставіць у цэнтр ўвагі сваей дзейнасьці, з прычыны асаблівай складанасьці задач, якія паўстаюць у гэтай галіне.

Важнейшай задачай у напрамку далейшага росту тэатральнага мастацтва, зьяўляецца падрыхтоўка тэатральных кадраў з працоўных карэнных нацыянальнасьцяў БССР і ў першую чаргу беларусоў.

Апошні пленум ЦК КП(б)Б канстатаваў **«наяўнасьць шэрагу істотных недахопаў у справе беларусізацыі і камплектаваньня апарату раду Наркаматаў, асабліва ў сэнсе ўмацаваньня беларускімі кадрамі»**. Гэтакае зьявішча мы наглядаем і на паасобных вучастках тэатральнага мастацтва.

Калі больш менш здавальняюча абстаіць справа з карэнізацыяй акторскіх кадраў, дык значна горш з рэжысерамі і тэатральнымі мастакамі. У нас яшчэ зусім мала беларускіх рэжысэраў, асабліва высокай кваліфікацыі, нават у буйнейшых тэатральных установах рэспублікі. Беларускія мастакі ў афармленьні спэктакляў амаль ня ўдзельнічаюць. Як правіла, мастакі для афармленьня паказаў запрашаюцца з іншых арганізацый.

Асабліва небясьпечным вучасткам у галіне беларусізацыі і карэнізацыі кадраў зьяўляецца Белдамэц. Малыя тэатральныя формы—эстрада зьяўляецца найбольш масавым відам тэатральнага мастацтва. Між тым, на гэтым вучастку мы маем простае скажэньне ленінскае нацыянальнае палітыкі. Да гэтага часу **яшчэ зусім ня створана беларуская эстрада—няма** выканаўцаў размоўнага жанру на беларускай мове. Мюзік-хол, які працаваў цэлае лета ў Менску, ня даў, за выключэньнем аднаго дуэта, ніякіх выступленьняў на беларускай мове.

Дзяляцкія гутаркі пра нерэнтабельнасьць беларускіх брыгад, гутаркі пра адсутнасьць рэпэртуару, кадраў сьведчаць пра палітычную блізарукасьць кіраўнікоў Дамэцу.

Гэткая практыка па сутнасьці зьяўляецца аб'ектыўна вялікадзяржаўніцкай з боку камуністаў, якія кіруюць Дамэцам.

Партыйная ячэйка, у якую ўваходзяць камуністы Дамэца нясе поўную адказнасьць за гэтыя скажэньні ленінскай нацыянальнай палітыкі і простых дырэктыў нашай партыі.

Зусім ненармальным зьяўляецца адсутнасьць вывучэньня беларускае мовы, літаратуры і г. д. у паасобных нашых небеларускіх тэатрах.

Мы напамінаем пастанову сьнежаньскага пленуму ЦК КП(б)Б: **«пленум ЦК падкрэсьлівае, што справа беларусізацыі зьяўляецца аднэй з важнейшых першачарговых задач партарганізацыі і што ўсякая недаацэнка гэтай задачы будзе сустракаць з боку партыі самы рашучы адпор».**

Галоўмастацтва і ЦП працмастацтва павінны рашуча рэагаваць на становішча рэчаў у Дамэцы і ўжыць неадкладныя мерапрыемствы па падрыхтоўцы новых караных тэатральных кадраў.

Партыйныя і прафсаюзныя арганізацыі нашых тэатраў павінны забясьпечыць разгортваньне сыстэматычнай работы па вывучэньню беларускае мовы, літаратуры, эканомікі і гісторыі БССР.

Новыя запатрабаваньні да тэатральнага мастацтва патрабуюць ліквідацыю адставаньня тэакрытыкі, далейшай актывізацыі яе і ўзьняцьця яе ідэёва-тэарытычнага ўзроўню на больш высокую ступень, узмацненьня барацьбы на два франты ў тэатральным мастацтве і мастацтвазнаўстве.

Тэатральныя рэцэнзіі павінны дапамагаць «гледачу правільна зразумець і ацаніць спэктакль (концэрт, кінокарціну, цыркавае відовішча—усё-роўна) Рэцэнзія—гэта калі газэта выхоўвае свайх чытачоў, арганізуе іх на вырашэньне баявых гаспадарча-палітычных задач» («Правда» Што такое тэатральная рэцэнзія). Наша тэатразнаўства павінна ўзмацніць работу па вывучэньню творчасьці паасобных тэатраў, рэжысараў, актораў і г. д.

Вырашэньне задач, якія стаяць перад тэатральным мастацтвам немагчыма без шчыльнай сувязі нашых тэатраў з пралетарскай грамадзкасьцю.

Зусім недапушчальным зьяўляецца бязьдзейнасьць мастацка-палітычных саветаў пры тэатрах, якія заклікаюць актыўна дапамагаць у рабоце нашых тэатраў.

Партыйныя ячэйкі тэатраў і прафсаюзныя арганізацыі павінны забясьпечыць перабудову работы мастацка-палітычных саветаў, мабілізуючы іх на выкананьне задач, якія ставіць сучасны этап сацыялістычнага будаўніцтва перад тэатральным фронтам, уключыўшы іх у барацьбу за якасьць драматычных твораў, якія ставіць тэатр, у абмеркаваньне пастановачных плянаў, масавай працы тэатру і інш.

Многія тэатры паказалі узоры масавай мастацкай працы, уключыўшыся сваімі брыгадамі ў правядзеньне баявых гаспадарча-палітычных кампаній, як'я праводзіць партыя.

Тэатры павінны і цяпер праз свае шэфскія арганізацыі, пад кіраўніцтвам партарганізацыі ўключыцца сродкамі тэамастацтва ў барацьбу **за выкананьне загатоўчых плянаў**, за павышэньне ўраджайнасьці і падрыхтоўку да веснавой пасеўнай кампаніі.

Мы падыходзім да першага году другой пяцігодкі. Дырэктывамі сакавіцкага пленуму ЦК і ЦКК КП(б)Б прадугледжаны вялікі рост сеткі тэатральных установ у другой пяцігодцы.

Забесьпячэньне работы разгортваньня новых мастацкіх адзінак павінны быць у асяродку ўвагі ўсіх **кадраў працуючых на мастцкім фронце.**

Тэатральны фронт, перабудоўваючыся ў сувязі з новымі задачамі пад кіраўніцтвам партыі, у барацьбе на два франты за генэральную лінію партыі даб'ецца стварэньня сапраўдных Магнітабудаў тэатральнага мастацтва.

## Новая п'еса Максіма Горкага

Маскоўскі дзяржаўны тэатр імя Вахтангова атрымаў для пастаноўкі новую п'есу А. М. Горкага «Достигаев и другие», якая зьяўляецца другой часткай задуманай Аляксеем Максімавічам тэатралёгіі.

У гэтай п'есе дзейнічаюць усе ранейшыя пэрсонажы, што і ў «Егор Булычёв и другие» за выключэньнем двух: Булычова, які памёр хутка пасьля Лютаўскай рэвалюцыі, і Башкіна. П'еса ахапляе пэрыяд часу з ліпеня да кастрычніка 1917 г. Вобраз Дасьцігаева (які дзейнічае і ў п'есе «Егор Булычов») тут атрымоўвае поўнае разьвіцьцё, ён паўстае перад гледачом буйнай постацьцю, разумным і хітрым купцом, які імкнецца прыстасавацца да новых абставін, які марыць пра перамогу над пралетарскай рэвалюцыяй ня ўзброеным шляхам, а больш тонкімі мэтадамі клясавае барацьбы.

У п'есе паказана цэлая галярэя тыпаў былой купецкай і абшарніцкай Расіі. Ёсьць многа надзвычайна глыбокіх і цікавых вобразаў (Рабінін, Нястрашны, барадаты салдат і інш.)

У вобразе барадатага салдата Горкі дае цікавы прыём паказу без масавых сцэн, у аднэй постаці, у адным вобразе ўсяе салдацкае масы, якая рабіла Кастрычніцкі пераварот.

П'еса «Достигаев и другие» прынята да пастаноўкі тэатрам імя Вахтангова і мае быць паказана ў сакавіку месяцы 1933 г.

## Плян правядзеньня творчых вечароў у Доме Пісьменьніка

**(сьнежань—32 г. студзень-люты 1933 года)**

**20 сьнежня—Творчы вечар Кандрата КРАПІВЫ (дакл. праф. Замоцін), 30 сьнежня—Творчы вечар Ул. ХАДЫКІ (дакл. тав. Кучар), 10 студзеня—Творчы вечар М. ЛУЖАНІНА (дакл. тав. Глебка), 20 студзеня—Творчы вечар К. ЧОРНАГА (дакл. праф. Піотуховіч), 30 студзеня—Творчы вечар М. ЗАРЭЦКАГА (уступнае слова П. Галавача), 10 лютага—Творчы вечар Р. КОБЕЦА (дакл. В. Вольскі), 20 лютага—Творчы вечар С. БАРАНАВЫХ (дакл. тав. Р. Ляпіч), 30 лютага—Творчы вечар З. БЯДУЛІ (дакл. тав. Барысёнак), 10 сакавіка—Творчы вечар П. ГЛЕБКІ (маё разуменьне паэзіі).**

**Пачатак вечароў а 7-ай гадз. увечары.**

**Уваход на ўсе вечары вольны.**

## Усеўкраінская драматургічная нарада

У Харкаве, пад кіраўніцтвам старшыні Аргкамітэту Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў УССР тав. КУЛЫКА, адбылася творчая драматургічная нарада скліканая Аргкамітэтам ССПУ і УсеУкомдрамам. На нарадзе быў заслуханы вялікі даклад тав. Шчупака «Становішча сучаснай Украінскай драматургіі»—пабудаваны на крытычным разглядзе—аналізе п'ес сучасных савецкіх пісьменьнікаў: Мікітэнка, Любчэнка, Куліша, Ірчана, Карнейчука, Першамайскага, Левіцкай і інш. Даклад выклікаў жвавы абмен думак. У спрэчках выступалі т. т. С. Падольскі, Амаглабелі (Масква), Мікітэнка, Куліш, Мамантаў і інш. Нарада працягвалася 4 дні. Дыскусія прыцягнула вялікую аўдыторыю пісьменьнікаў, рэжысераў, актораў, студэнтаў і інш. Ад Беларускага таварыства драматургаў і кампазытараў на нарадзе прысутнічаў і выступаў у спрэчках тав. Ільля Гурскі.

## Зрываецца работа

Інстытут Літаратуры і Мастацтва Акадэміі Навук БССР канчае работу па складаньні біяграфічнага слоўніку беларускіх пісьменьнікаў.

Ня гледзячы на неаднаразовыя напамінкі, шэраг пісьменьнікаў да гэтага часу ня далі сваіх аўтобіяграфій, таму Інстытут ЛІМ звярачаецца праз газэту да т. т. Вольнага, Зарэцкага, Клішторнага, Куляшова, Каваля, Калюгі, Маракова, Неманскага, Плаўніка, Пасьлядовіча, Чарота, Чорнага з просьбай даць свае аўтабіяграфіі да 30 сьнежня.

**Інстытут ЛІМ АН БССР**

## А. Усс

## Пра задачы выяўленчага мастацтва БССР

Выяўленчае мастацтва, як мэтад ідэалёгічнага мастацкага выхаваньня працоўных мас у нашым грамадзкім жыцьці займае вялізарнае месца. Актуальны палітычны лёзунг ярчэй, выразьней выступае перад вачыма мас, калі ён у простай, зразумелай вобразнай форме занесены на палатно мастаком. Тая, або іншая сацыяльная задача, навуковая думка, ідэя—робіцца больш даступнай, і зразумелай масаваму гледачу, калі яна мастаком глыбока прадумана і майстэрскі выяўлена на плякаце, у табліцы наглядных дапаможнікаў, ці мастацкай карціне. Кожны добры плякат, хораша выкананая мастацкая карціна, акрамя таго, што яны ў відавочнай і разумелай форме даюць нашаму рабочаму, калгасьніку тую альбо іншую ідэю, яны паглыбляюць, разьвіваюць яго інтэлект, узьнімаюць на вышэйшую ступень яго культурны ўзровень. І пры добрай, глыбока-прадуманай, палітычна-правільнай пастаноўцы гэтага пытаньня выяўленчае мастацтва выпрацоўвае ў гледача—рабочага і калгасьніка—правільны, здаровы погляд на сьвет, на жыцьцё, на мастацтва і інш. Пры правільнай пастаноўцы выяўленчае мастацтва выхоўвае ў гледача здаровы мастацкі густ, выхоўвае разуменьне гэтай вельмі тонкай і вострай ідэалёгіі.

У эпоху вялізарнага сацыялістычнага будаўніцтва, у эпоху карэннай ломкі і перапрацоўкі ня толькі нашай эканомікі, але, і самога чалавечага матэр'ялу, яго псыхікі, сьветапогляду і новага сьветаразуменьня і сьветаадносін—перад выяўленчым мастацтвам стаяць вялізарныя задачы ў справе перавыхаваньня працоўных мас. «Дыктатура пралетарыяту, як гаворыць Ленін, ёсьць упартая барацьба, крывавая і бяскроўная, гвалтоўная і мірная, ваенная і гаспадарчая, пэдагагічная і адміністрацыйная, супроць сіл і традыцый старой грамады». І мастацтва ў гэтай ідэалёгічнай клясавай бяскроўнай барацьбе ў наш час павінна займаць адно з першых месц. Кожны мастак, пісьменьнік, які палітычна-правільна разумее і праўдзіва адбівае наша сучаснае жыцьцё, ёсьць змагар на гэтым бяскроўным ідэалёгічным фронце. Ён павінен яскрава выразна ўяўляць сабе тое становішча, у якім зараз знаходзіцца пралетарыят. Пісьменьнік, мастак не павінен забываць пра тое, што мы жывем у эпоху бурнага сацыялістычнага будаўніцтва, жывем у гістарычны момант барацьбы сацыялізму з капіталізмам у адказнейшы момант барацьбы пралетарыяту з сусьветнай буржуазіяй, якая культурна яшчэ ў шмат разоў мацней за нас. У такі момант барацьбы мы павінны напружваць усе свае сілы на фронце працы, навукі, мастацтва і адстойваць сацыялістычнае будаўніцтва, у тэорыі і практыцы, шукаць і адстойваць новыя мэтады сацыялістычнае працы, новыя мэтады гаспадараньня, будаўніцтва і найлепшымі прыкладамі і мэтадамі практычнага кіраўніцтва змагацца супроць сусьветнай буржуазіі і яе гнілой ідэалёгіі. Мы павінны змагацца супроць яе атрутных рэштак у нашай краіне, шляхам ідэёвым, шляхам выхаваньня, каб звычкі у навыках, перажываньні, якія рабочая кляса набыла сабе на працягу дзесяцігодзьдзяў ў барацьбе за сацыялізм, за лепшае жыцьцё, каб уся сума гэтых звычак, навыкаў і ідэй паслужыла сродкам выхаваньня ўсіх працоўных. А задача вырашэньня пытаньня пра тое, як менавіта выхаваць, кладзецца на пралетарыят, на яго партыю, на лепшую сьвядомую частку яго інтэлігенцыі. У гэтай справе роля пісьменьніка, мастака—вялізарная роля. Неабходна выхаваць сьвядомасьць, што нельга, недапушчальна стаяць у баку ад жыцьця, па-за барацьбой пралетарыяту за лепшую будучыню, па-за тым сацыялістычным будаўніцтвам, якое з кожным днем ахапляе ўсё большыя і большыя вучасткі нашага культурна-гаспадарчага, палітычнага і грамадзкага жыцьця.

XVII Усесаюзная партканфэрэнцыя паставіла перад партыяй, перад рабочай клясай, а адсюль і перад работнікамі мастацтва, і літаратуры, перад работнікамі культурна-выхаваўчага ідэалёгічнага фронту—пісьменьнікамі і мастакамі—задачу вялізарнага гістарычнага значэньня—у другой пяцігодцы поўнасцю зьнішчыць у нашай краіне капіталістычныя элемэнты і клясы наогул. Адсюль самая адказная і самая вялізарная задача пісьменьніка і мастака—гэта выхаваньне працоўных мас у дусе сацыялізму, у дусе камуністычных пачаткаў. Мастак і пісьменьнік сваімі творамі, сваёй творчай работай павінен дапамагчы партыі, дапамагчы пралетарыяту выкарчоўваць рэшткі капіталізму ў нашай краіне. Дапамагчы рабочай клясе і сялянству скінуць з сябе старую вопратку Адама капіталістычнага ладу, пазбыцца старых дапатопных звычак у працы, пазбыцца некультурных навыкаў у сваіх ўзаемаадносінах. Дапамагчы пралетарыяту ў агні сацыялістычнага будаўніцтва пазбавіцца ад наростаў эканамічнай, палітычнай і іншай нечысьці капіталістычнай грамады. Дапамагчы стварыць простыя, крыштальна чыстыя вытворчыя адносіны бясклясавага чалавечага грамадзтва. Беднага і сярэдняе сялянства, ўступіўшы ў калгасы і ператварыўшыся ў сапраўдную і моцную апору рабочае клясы, страціла шэраг сваіх старых эканамічных клясавых адзнак, яно зрабіла рашучы крок у сваім эканамічным і палітычным разьвіцьці ў бок набліжэньня да пралетарыяту. Гэтым калгаснае сялянства якасна адрозьніваецца ад аднаасобнікаў. Але калгаснае сялянства яшчэ ня страціла поўнасцю клясавых рыс, адзнак, звычак і навыкаў, якія ўласьцівы дробнаму сялянству. Палітычная і ідэалёгічная розьніца між пралетарыятам і сялянствам у тым, што калі рабочая кляса і батрацтва БССР прайшлі суворую школу прадпрымальніцкай і абшарніцкай эксплёатацыі і палітычнай барацьбы ва ўмовах капіталізму, школу XV-гадовай барацьбы і арганізацыі сацыялістычнай вытворчасьці, школу сумеснай сацыялістычнай працы, то калгаснае сялянства, хаця яно ў значнай сваёй масе пад кіраўніцтвам пралетарыяту і яго партыі прымала ўдзел у грамадзянскай вайне і барацьбе супроць кулацтва, у арганізацыі і будаўніцтве першых пачатковых форм кааперацыі і тым самым прайшло пэўную палітычную і кааперацыйную школу, ўсё-ж калгасьнікі — гэта ўчарайшыя аднаасобнікі[1], якія яшчэ не пазбавіліся ўсіх рысаў прыватнай уласнасьці, у якіх настроі прыватнай уласнасьці яшчэ і зараз падтрымліваюцца рэшткамі індывідуальных гаспадарак. Дробна-буржуазныя адносіны да працы і дробна-уласьніцкая ідэалёгія і псыхолёгія, зьвязаныя з учарайшым мінулым калгасьнікаў, не адпадаюць адразу пры пераходзе сялян на сацыялістычны шлях разьвіцьця. Патрэбна вялізарная арганізатарская работа, клясавая настойлівасьць і энэргія з боку рабочае клясы і яго партыі для таго, каб ліквідаваць гэтыя рэшткі дробна-буржуазных клясавых рыс калгаснай гаспадаркі. І пісьменьнік, мастак у гэтай справе, у справе перавыхаваньня калгаснага і аднаасобнага сялянства мае і будзе мець вялізарную ролю. У рабочым, у селяніне-калгасьніку, у іх псыхіцы, у іх працоўных узаемаадносінах, вырабатываюцца і ёсьць новыя элемэнты, новыя адзнакі новага творцы сацыялістычнага жыцьця. Мастак павінен умець знайсьці, вылучыць у старым новае. Яно ужо ёсьць у нашым жыцьці, у быту, у вытворчасьці. Яго толькі патрэбна найсьці, разгледзіць, і ў мастацтве, у літаратуры ўмець адбіць, глыбока і ўсебакова паказаць і дзёва разьвіць. Умець паказаць новыя бакі нашага быту, грамадзкага жыцьця, працы і г. д. Паказаць новага чалавека, героя нашага сацыялістычнага будаўніцтва, героя нашых дзён—рабочага-ўдарніка, добрага адказнага работніка, кіраўніка, прыкладнага грамадзкага работніка. Паказаць іх поўнакроўнымі, сакавітымі, жывымі. Мастак павінен найсьці гэта новае, падкрэсьліць у ім хоць адну невялікую рысу гэтага новага і ўжо па гэтай, хаця і невялікай рысы павінен ўмець стварыць новыя вобразы, цэлыя характары новых небывалых людзей. А для гэтага мастак павінен быць назіральным, павінен ведаць і разумець ва ўсёй паўнаце і глыбіне наша сучаснае жыцьцё, нашу сацыялістычную рэчаіснасьць. Становішча мастака, як грамадзкага дзеяча, яго празьмерна высокая і ў той-жа час празьмерна своеасаблівая прафэсія, спэцыяльнасьць, па выработцы жыцьцёвых ілюзій, вобразных уяўленьняў—абавязвае яго штодзённа і штогадзінна прагна ўпівацца ў жыцьцё, уразацца ў яго глыбіню. Глыбока вывучаць і разумець яго, і ня толькі назіраць вачыма пабочнага безудзельнага гледача, але і [illegible] сапраўднаму пазнаецца толькі ў дзеяньні. Толькі тады будзе жывая творча-каштоўная работа мастака ў яго майстэрні, каля мальбэрту. Мастак, акрамя ўменьня назіраць, акрамя тонкага ўспрыняцьця і разуменьня жыцьцевых зьяў павінен умець і адчуваць іх. Адчуваць павінен ня холадна, не безудзельна адносіцца да таго, што ён адбівае. Мастак, адбіваючы зьяву жыцьця павінен асьвяціць гэту зьяву сваім шматбаковым разуменьнем, сагрэць яе сваім нутраным, цэлым пачуцьцём і вось толькі тады са звычайнай, простай вытворчай сцэны, або бытавой карціны ўзьнікае сапраўдны мастацкі твор, які будзе поўны пачуцьцяў, эмоцый і настрояў. Хто па прыродзе, па свайму разьвіцьцю ўспрымальны і да таго-ж, калі ён авалодаў ўменьнем перадаваць свае ўражаньні, свае разуменьні другім, ды так, каб яны маглі адчуць і перажыць тое, што ён сам адчувае і перажывае, той і мастак. Уменьне перадаваць складае тэхнічны бок мастацтва і набываецца практыкай, доўгай упартай працай. Уласьцівасьць успрымаць складае прыналежнасьць чалавецкага характару мастака, але яе патрэб разьвіць адукацыяй, выхаваньнем, зносінамі з людзьмі з жыцьцем. Адно уменьне перадаваць альбо віртуознасьць формы, як гэта думаюць некаторыя з нашых сучасных мастакоў, само па сабе яшчэ нічога не гаворыць гледачу. Можа быць напісаны ярка і падрабязна твар чалавека так, што гледач бачыць кожную маршчынку на яго лбе, кожны валасок на яго брывах і г. д. На кожнай з нашых выставак мы сустракаем багата падобных карцін, партрэтаў. Мастак піша вам ударнікаў, партрэты правадыроў, вытворчыя працэсы, домны, заводы—усё абмалёўвае, выпісвае з вялікай старанасьцю, з вялікай руплівасьцю. Непрактыкаваны глядач гаворыць: «Ах, як гэта ўсё праўдзіва, жыва». Нос, вочы, вушы—ўсё на месцы ў намаляванага ўдарніка, а ўдарніка няма, няма характару, няма становішча і перажываньняў гэтага ўдарніка, няма мастацтва. І калі гледзіш на такую карціну, то не ўяўляеш сабе, каб мастак, які рупліва вырысоўваў ўсе дэталі твару, вопраткі ўдарнікаў, што небудзь думаў, або адчуваў, бо мастак нічога ня думаў, нічога не адчуваў, а толькі мэханічна пераносіў на палатно тое, што бачыў. Ёсьць і такія мастакі, што параўнаўча ня дрэнна камбінуюць фарбы, лоўка кладуць мазкі, але чалавечага характару яны не перадаюць, ні думак, ні пачуцьцяў у іхных творах убачыць нельга. Такі мастак марна губляе час і свае ўменьне на дробязі, на фармальныя шуканьні дзеля іх саміх. Фармалізм дзеля фармалізму. Гэта адбываецца таму, што мастак ня ўмее назіраць, ня цікавіцца жыцьцёвымі зьявамі. Яго цікавіць толькі сам працэс пісаньня, ён не настолькі разьвіты, каб умець знайсьці, перадаць сваю ідэю. У кожным выпадку, такі мастак толькі па назву мастак. Ён настолькі мастак, наколькі можа быць названы мастаком швец, які добра шые боты. Пісьменьнік ніколі ня можа займацца бяззьместоўным словасплятаньнем, ня можа займацца спалучэньнем слоў, гукаў дзеля іх саміх. Бяззьместоўнае спляценьне слоў у літаратуры не магчыма. Пісьменьнік у сваім творы павінен нешта сказаць, нешта выразіць, а інакш ніхто яго ня будзе чытаць, ніхто ім ня будзе цікавіцца.

Ня тое ў мастака жывапісца. Мастак можа напісаць карціну не выразіўшы ніякай ідэі, ніякіх пачуцьцяў. Гэта дае магчымасьць бяздзейнаму мастаку займацца ў жывапісі дробязямі, бяздзейнасьцю, займацца спалучэньнем каляровых плям, таноў і думаць, што гэтымі нікчэмнымі заняткамі ён дае карысьць мастацтву, карысьць грамадзкасьці. Адсутнасьць думкі, ідэйнасьці ў гэтых мастакоў яны імкнуцца замаскаваць віртуознасьцю каляровай кампазыцыі, затушаваць віртуознасьцю мазка, але іх мастацтва заўсёды пазбаўлена ідэі, думкі і ніколі не захапляе гледача, ня робіць моцнага ўражаньня. Такім мастакам, калі яны жадаюць быць сваёй творчасьцю карыснымі пралетарыяту, патрэбна сябе перамагчы, патрэбна адмовіцца ад сваіх пустых фармалістычных шуканьняў. Патрэбна вучыцца ў буржуазных майстроў, але не эпохі заняпаду буржуазнага мастацтва, у мастакоў ня гнілога, падыхаючага капіталізму, творчасьць якіх наскрозь прапітана голым «вещизмом», містыкай, ідэалізмам, уся кай папсоўшчынай і чартаўшчынай, што часткова мае месца ў некаторых нашых мастакоў, якія хаваюцца за «фармальнымі шуканьнямі». Трэба вучыцца ў моцных, вялікіх, здаровых буржуазных мастакоў. У тых майстроў, якія ў сваёй творчасьці адбівалі настроі узьнімаючайся рэвалюцыйнай буржуазіі, той буржуазіі, якая ў свой час змагалася з фэадалізмам, разьвівалася і ішла наперад. У мастацтве і навуцы гэтай буржуазіі можна багата што браць і нам. Мастацтва-ж імпэрыялізму ў якім адбіваецца ідэалёгія гніючага капіталізму нам, акрамя шкоды, нічога ня дасьць. Патрэбна вучыцца ў старых майстроў сусьветнага значэньня. Вучыцца ня толькі па іх творах, што бязумоўна зьяўляецца самым каштоўным у вучобе для нашага мастака, які як тэхнічна, так і культурна вельмі і вельмі яшчэ слабы. Трэба, па магчымасьці, знаёміцца з іх жыцьцём, з біяграфіяй, з іх практычнай работай. Паглядзець як яны вучыліся, як працавалі над сабою і над сваімі творамі. Возьмем напрыклад хаця-б Рэпіна.

Рэпін любіў тых тыпаў, людзей, якіх заносіў на свае палотны. Ён за імі хадзіў, з вялікімі цяжкасьцямі шукаў і знаходзіў жывых людзей, такіх людзей, якія адпавядалі-б яго замыслу, задуманай ідэі. Вось чаму, гэроі Рэпіна—гэта жывыя, сакавітыя вобразы. Ён браў іх з жыцьця, з самае рэчаіснасьці і толькі сваёй фантазіяй, сілаю сваёй творчасьці даводзіў іх да ідэалу, а ў аснове кожнага вобразу ляжыць сапраўдная, жывая постаць чалавека. Пагэтаму гэроі Рэпіна ня схэмы, а сапраўдныя жывыя людзі, толькі асьветленыя нутраным сьвятлом мастака, аб вельным яго над паэзіяй і ў моц гэтага яны выклікаюць ў гледача спачуваньне да сябе, бо гэта мастацтва, сапраўдная творчасьць, а мастацтва заўсёды захапляе і кранае людзей за душу. Мастак гэта вучоны, своеасаблівы дасьледца жыцьцёвых зьяў. Ён павінен назіраць і вывучаць жыцьцё ва ўсёй паўнаце, яго затоеныя глыбіні; паказаць яго чытачу, гледачу ў адпаведным напрамку, у адпаведным настроі. А пагэтаму трэба вучыцца ў самага жыцьця і вялікіх майстроў мастацтва. Партрэты Тыцыяна, Веляскеза і некаторых іншых майстроў мастацтва пры моцнай падкрэсьленнасьці ў іх індывідуальных асаблівасьцяй маюць і агульную рысу. Створаныя імі асобы крэўныя між сабою. Агульнае у іх абодвых гэта—празьмерна - падкрэсьлены арыстакратызм, адорак асяродзьдзя і часу, ва ўсіх асоб—гэта «самозабвение взора» які накіраваны ўдалеч альбо ўходзіць у глыбіню сваёй душы іншы раз здаецца, што позірк іх шукае менавіта цябе; але падыйсьці бліжэй і позірк партрэту праціцае цябе, як быццам накіраваны ў іншую рэчаіснасьць, у нейкае асаблівае нутранае жыцьцё, якое схавана ад нас. Вось гэтаму майстэрству, уменьню перадаваць псыхіку чалавека праз вонкавыя адзнакі яго нутраную клясавую сутнасьць патрэбна вучыцца і нам. Трэба ўмець таксама моцна эмоцыяльна перадаваць псыхіку рабочага—ударніка. А для гэтага патрэбна ведаць і разумець, што такое рабочы па сваёй клясавай сутнасьці. Патрэбна адчуваць рабочага ў яго клясавай сутнасьці, як гэта ўмелі разумець і адчуваць буржуазныя мастакі людзей сваёй клясы.

Наш мастак наколькі яшчэ малады, слабы, настолькі ён ганарлівы. Ён іншы раз ня прымае ніякай крытыкі, ніякіх абмеркаваньняў, а гэта ўжо ёсьць дрэнны бок мастака, гэта перашкаджае яму шукаць да сябе ўвагі, шукаць да сябе крытыкі. У яго на першым пляне вышэй за ўсё стаіць яго ганарлівасьць, самалюбаваньне. Для мастака-ж вышэй яго ганарлівасьці павінна быць дасканаласьць яго твору. Вялікія мастакі, пісьменьнікі не баяліся крытыкі, яны, якая-б ня была крытыка ці абмеркаваньні, заўсёды імкнуліся знайсьці што-небудзь карыснае для сябе. Калі рабілі напады на «Мертвые души»—прыяцелі Гоголя вельмі абураліся, а Гогаль ім пісаў наступнае: «Вы дарэмна абураецеся на надмерны тон некаторых нападкаў на «Мертвые души»: гэта мела свой добры бок. Іншы раз трэба мець супроць сябе азлабленых. Хто захоплены прыгожасьцю, той ня бачыць недахопаў і даруе ўсё; але хто азлаблены, той зробіць ўсё магчымае, каб выкапаць у вас усю дрэнь і выставіць яе так ярка знадворку, што нехаця яе ўбачыш. Ісьціну так рэдка даводзіцца чуць, што ўжо за адно зерне яе можна дараваць усякі ўразьлівы голас, з якім бы яна не гаварылася. У крытыках Булгарына, Сянкоўскага і Палявога ёсьць шмат правільнага, пачынаючы нават з дадзенай мне парады павучыцца перш-наперш рускай граматыцы, а потым пісаць. Сапраўды, калі-б я не сьпяшаўся з друкаваньнем рукапісу і патрымаў яго ў сябе з год, я ўбачыў бы потым і сам, што ў такім няпрыемным выглядзе яму ніяк нельга было зьявіцца ў сьвет. Самыя эпіграмы і кпіны нада мною былі мне патрэбны, ня гледзячы на тое, што з першага разу давялося не па сэрцу. Ой, як нам патрэбны беспярэстанныя пстрычкі і гэтыя трапныя кпіны, што працінаюць цябе наскрозь. На дне душы нашай столькі ёсьць усякай дробнай, нікчэмнай ганарлівасьці, паганага чэсталюб'я, што нас што-хвіліны патрэбна біць і г. д.».

Патрэбна вучыцца ў старых майстроў уважліва адносіцца і да дрэннай крытыкі! Мастацтва гэта не асабовая справа кожнага з нас, гэта грамадзкая і вельмі важная справа, якая асабліва ня церпіць празьмернай раздражлівасьці з боку мастака. Яно патрабуе сур'ёзных удумлівых адносін, як да самога сябе, так і да навакольных. Патрэбна далейшае пашырэньне між народнай савецкай тэматыкі ў нашай жывапісі і скульптуры. Патрэбна паказаць нашае сацыялістычнае жыцьцё, быт рабочых. Паказваць жыцьцё спэцыяліста, пісьменьніка, мастака, служачага, жыцьцё сялян. Паказаць жыцьцё рабочых у буржуазных краінах, барацьбу за сацыялізм у капіталістычным умовах. Патрэбна ставіць у выяўленчым мастацтве і праблемы навукі, мастацтва ў буржуазных краінах і ў нас. Трэба адзначыць, як недахоп, у нашым беларускім мастацтве нават па лініі самой тэматыкі, гэта амаль абсалютная адсутнасьць тэм з жыцьця нашых таварышоў Заходняй Беларусі, што як была, так і засталася пад панскай пятой і стогне пад уціскам польскага імпэрыялізму. Штодня газэты прыносяць нам новыя весткі пра нячуваныя зьдзекі польскай паліцэйшчыны над беларускім пралетарыятам і сялянствам. Для Заходняй Беларусі прышлі горшыя часіны гішпанскай інквізыцыі, часіны панаваньня бізуна і ксяндзоўскай сутаны. І гэта зразумела. Бізун, сьвінец ды ксяндзоўская сутана—гэта яшчэ тое, за што можа хавацца польская буржуазія, за што яшчэ могуць хавацца панскія маёнткі. І чым мацней расьце крызіс, голад, беспрацоўе; чым больш пагрозьліва паўстае перад фашызмам здань пралетарскай рэвалюцыі, тым мацней і тым з большым разьюшаньнем драпежнік фашызму душыць і рве на часткі пралетарыят і сялянства Заходняй Беларусі і Заходняй Украіны.

Наша беларускае мастацтва гэтыя зьдзекі польскага фашызму над беларускім пралетарыятам і сялянствам павінна зганьбаваць, адбіць і выставіць на паказ усяму сьвету. У гэтым напрамку у нашым мастацтве амаль нічога ня робіцца, за выключэньнем старых таварышоў пісьменьнікаў, асабліва Якуба Коласа,—які часта з душэўным болем адгукаецца у нашым друку на тыя зьдзекі польскіх акупантаў, якія адбываюцца цяпер у Заходняй Беларусі. Толькі ён адзін ганьбіць фашыстоўскіх інквізытараў, а моладзь маўчыць. Гэты прабел у нашай тэматыцы трэба запоўніць. На гэта патрэбна зьвярнуць сур'ёзную ўвагу, заваструць пытаньне у выяўленчым мастацтве. Гніючы капіталізм, гніючая кляса буржуазіі у сваёй палітыцы і практыцы даходзіць да цынізму, да гвалту, да бесчалавечнасьці як у свой час падыхаючы фэадалізм у барацьбе з буржуазіяй і сялянствам дайшоў да мэтадаў інквізыцыі. Буржуазія узьнімае пытаньне пра заборону займацца навукай, вынаходніцтвам і інш. У панскай Польшчы праследуюць людзей за атэізм, людзей саджаюць у турмы за тое, што яны не прызнаюць існаваньня чорта. А у разуменьні польскага клерыкалізму—калі чалавек ня прызнае чорта, ён гэтым самым ужо ня прызнае і бога, бо чорт—гэта адна з супрацьлегласьцяй бога. Капіталізм гніе, а разам з ім гніе і яго фаустоўская культура, і пралетарыят сваей культурай, сваім рэвалюцыйным рухам павінен дапамагчы буржуазіі дагніць, зваліцца. А дзеля гэтага пралетарыят павінен узброіцца навукай, мастацтвам, ведамі. Рэвалюцыйным шляхам ён павінен скінуць, перамагчы усе бясчалавечныя жыцьцёвыя умовы сучаснае грамады, якія грунтуюцца, як Маркс гаворыць, у яго, становішчы—ён не дарэмна праходзіць суровую, але загартоўную школу працы. Справа ня у тым, у чым у сучасны момант бачыць сваю мэту паасобны пралетары, ці нават увесь пралетарыят. Справа у тым, што такое пралетарыят па сутнасьці і што ён, згодна гэтаму свайму быцьцю, будзе гістарычна вымушаны рабіць. Яго мэта і яго гістарычная місія самым ясным і бясспрэчным чынам паказваецца яго уласным жыцьцевым становішчам, таксама як і усей арганізацыі сучаснага буржуазнага грамадзтва.»

Вось гэту клясавую сутнасьць пралетарыяту, яго гістарычную місію, як далакопа капіталізму і творцы новага бясклясавага грамадзтва, патрэбна ведаць і разумець кожнаму мастаку, які бярэцца рабіць партрэт з рабочага. У сучасны момант пралетарыят, дзякуючы рабоче кампартыі, у значнай сваей частцы ўжо моцна усьвядоміў сваю гістарычную задачу і стала працуе над далейшым разьвіцьцем і канчатковым праясьненьнем сваей самасьвядомасьці. Гэтаму павінны дапамагчы мастацтва, навука і асабліва пісьменьнікі і мастакі нашага Савецкага Саюзу. Наогул, патрэбна ахапіць больш усебакова пытаньні рэвалюцыйнай барацьбы заходняга пралетарыяту, пытаньні жыцьця нашай краіны, шырэй і глыбей імкнуцца ўскрываць іх сутнасьць. Няспынна ўзрастаючыя запатрабаваньні мас, рост іх культурнага ўзроўню—настойліва дыктуюць пра неабходнасьці паказу ў выяўленчым мастацтве ўсіх складанейшых працэсаў клясавай барацьбы, як ў краінах капіталізму, так і ўнутры нашай краіны; неабходнасьць паказу ў мастацтве ўсяе багацейшай, шматграннасьці нашай выключна складанай, яркай, гучнай, выразнай эпохі, якая перарабляе людзей, выкарчоўвае капіталістычныя перажыткі ў сьвядомасьці чалавека і рыхтуе яго да ўступленьня ў безклясавую грамаду.

# ЮБІЛЕЙ НАРОДНАГА ПАЭТА ЯКУБА КОЛАСА

## ПРАМОВА народнага паэта БССР Якуба Коласа

Таварышы!

Калі-б два, паўтара дзесяткі гадоў таму назад маім вачам прадставіўся той стан, той малюнак культурных нацыянальных здабыткаў народаў саюзу Савецкіх рэспублік і ў тым ліку Савецкай Беларусі, здабыткаў, якія маем мы на сёнешні дзень, то я не паверыў-бы ў іх рэальнасьць, я палічыў-бы іх за казку, за гульню фантазіі. А між тым намаганьнямі Савецкай улады і комуністычнай партыі, пры дапамозе братніх, савецкіх рэспублік гэта фантазія ператворана ў сапраўдную рэчаіснасьць. Ці трэба гаварыць аб іх тут, калі яны перад нашымі вачыма? Даволі аднаго толькі пералічэньня гэтых культурных дасягненьняў, здабытых Савецкай Беларусьсю на аснове ленінскай нацыянальнай палітыкі, каб рэальна адчуць іх вялічэзнасьць. І сапраўды, такія здабыткі культурнага будаўніцтва, як Акадэмія Навук, Дзяржаўны Унівэрсытэт, дзесяткі ВНУ і ВТНУ, сотні тэхнікумаў розных спэцыяльнасьцяй, тысячы сярэдніх і пачатковых школ, дзе гучыць беларуская мова і фармуецца новы чалавек; дзяржаўная бібліятэка з мільёнmen кніжным фондам; дзяржаўнае выдавецтва з шматмільённым тыражом беларускіх, яўрэйскіх, польскіх і іншых выданьняў; беларускія дзяржаўныя тэатры і тэатры іншых нацыянальнасьцяй БССР,—хіба гэта не гаворыць аб вялічэзнасьці нашых культурных здабыткаў?

І здабыткі гэтыя—толькі часьць, толькі адно зьвяно, адна кветка ў вянку іншых здабыткаў сацыялістычнага будаўніцтва нашай краіны. І ўсё гэта зроблена за дванаццаць і то няпоўных гадоў, здабыта пры напружанай, варожай міжнароднай абстаноўцы, у атмасфэры фальшывак, палітычных кампаній, махінацый—розных палітычных прайдох і авантурнікаў, у атмасфэры змоў, інтэрвэнцыяніцкіх замахаў, накірованых супроць саюзу Савецкіх рэспублік, усё гэта здабыта ва ўмовах вострага клясавага змаганьня, пры тысячы розных перашкод, як у форме звычайнага шкодніцтва, так і ў выглядзе прытоенага і яўнага сапраціўленьня з боку контр-рэвалюцыйнага нацыянал-дэмакратызму.

Калі беларуская літаратура старой, дарэвалюцыйнай Беларусі была прадстаўлена некалькімі імёнамі, для пералічэньня якіх хватала пальцаў аднэй рукі, то сучасная савецкая беларуская літаратура прадстаўлена сотнямі імён, дзесяткамі маладых выдатных талентаў, чыю мастацкую прадукцыю можна сьмела выносіць у людзі. Чым тлумачацца гэтыя посьпехі, гэты гіганцкі рост нашай культуры? Тым, што Кастрычніцкая рэвалюцыя, вызваліўшы многамільённыя масы працоўных ад гнёту капіталу, дала шырокі простор і ўсе магчымасьці для выяўленьня і рэалізацыі іх творчых здольнасьцяй і што сама савецкая рэчаіснасьць ёсьць бурная, нявычэрпная крыніца паэзіі тварэньня, паэзіі змаганьня за будаўніцтва сацыялізму, за новага чалавека, за новы быт у свабодным бясклясавым грамадзтве.

Калі я аглядаю пройдзеную дарогу, сваю літаратурную дзейнасьць у беларускім пісьменстве, то сама Беларусь паўстае перада мною ў трох постацях: старая Беларусь часоў царызму, заходняя Беларусь пад польскай акупацыяй і Беларусь Савецкая. Успамінаючы старую Беларусь, я не магу не ўспомніць аб З. Б., і параўнаньне іх напрашваецца само сабою. Старая Беларусь была «западной окраиной», калёніяй расійскай імпэрыі, З. Б. стала «усходнімі крэсамі», калёніяй панскай Польшчы. Адну Беларусь кляваў двухгаловы царскі арол, другую рве аднагаловы польскі «бялы ожэл». Царская Беларусь ведала эпохі Мураўёва, Сталыпіна з іх карнымі экспэдыцыямі, ваенна палявымі судамі, расстрэламі, шыбеніцамі, З. Б. ведае эпоху Майштовіча і яшчэ ў большых памерах карныя экспэдыцыі, ваенна-палявыя суды, растрэлы і тыя-ж шыбеніцы. Калі царскі ўрад у дачыненьні да культурных патрэб працоўных мас станавіўся варожа і груба выганяў з школ усё, што напамінала-б нацыянальныя асаблівасьці, то панская фашыстоўская рэакцыя накладае штрафы за ўжываньне дзецьмі у школах свайго матчынага слова.

І адна і другая чыніла і чыніць гвалт і зьдзекі над працоўным народам, над яго лепшымі сынамі,—змагарамі за справу працоўных мас, за іх вызваленьне з нацыянальнай і сацыяльнай няволі. І тыя-ж самыя царскія законы аб палітычных праступленьнях, аб «крамольніках» захоўваюць сваю сілу і зараз у ЗБ і розьніца паміж імі толькі тая, што адна цяжка стагнала, скованая кайданамі царскай няволі, а другая плача крывавымі сьлязамі, узьведзеная на эшафот фашысцкай Польшчай, якая да рэчы сказаць, задыхаецца ў эканамічным крызісе, не знаходзіць з яго выйсьця.

Калі параўнаць гэтыя дзьве постаці—царскай і З. Б. з Сав. Беларусьсю і калі прыняць пад увагу яе вялічэзныя здабыткі на фронце сацыялістычнага будаўніцтва, яе няспынны поступ наперад, яе ператварэньне з краіны адсталай, з былой царскай калёніі ў краіну аграрна-індустрыяльную, то ясным, бязпрэчным стане факт, які гаворыць за тое, што не буржуазны лібэралізм нацыянал-дэмакратычнай афарбоўкі, ні рэакцыйны фашызм у гусьце сацыял-здраднікаў, а толькі ленінская нацыянальная палітыка, толькі дыктатура пралетарыяту і кіруючая роля камуністычнай партыі забясьпечваюць народам буйны рост іх нацыянальнай культуры, нацыянальнай па форме, сацыялістычнай па зьмесьцу.

У гэты вечар, калі савецкая грамадзкасьць адзначае маё пяцідзесяцігодзьдзе, я павінен сказаць некалькі слоў і з поваду майго юбілею, асьвятквае яга там, на акрываўленых гонях З. Б., гонях, залітых крывёю рэвалюцыянэраў, змагароў за нацыянальныя і сацыяльныя інтарэсы працоўных мас, акупаваных польскім фашызмам. Сьвяткаваньне там адбылося 27 лістапада, напярэдадні суду над т. Тарашкевічам.

Мяне агортвае вялікі смутак, калі я думаю аб сьвяткаваньні там майго юбілею. Хто яны, гэтыя людзі, ініцыятары юбілею? Чыю выконваюць яны волю? Чыю робяць справу: ці справу працоўных мас беларускага народу, ад імя якога яны выступаюць, ці справу польскага фашызму, заняволіўшага беларускі народ?

Даволі назваць два імёны з гэтай групы, ксяндза Станкевіча і манархіста Багдановіча, каб мець прадстаўленьне аб ідэалёгічным твары ўсёй групы і яе палітычных установах. Гэта група так званых хрысьціянскіх дэмакратаў, або інакш хадэкаў. Пад нявіннаю шыльдаю культурніцтва, прыкрываючыся левымі фразамі, і лёзунгамі, гуляючы ў апазыцыю з польскім урадам, пад прыязнаю апекаю польскай паліцыі, той паліцыі, што таксама апякуецца, але апекаю іншага парадку, і над тысячамі палітзьняволеных за кратамі польскіх астрогаў, яны, гэтыя «культурныя» людзі, усю сваю дзейнасьць, усю сваю мэтаімкненасьць накіроўваюць на тое, каб прытупіць, згладзіць вастрату палітычнага змаганьня працоўных мас за сваё нацыянальнае і сацыяльнае вызваленьне, каб адарваць іх ад уплыву, вялікага ўплыву, які мае на іх кампартыя Заходняй Беларусі, каб зьвярнуць іх з адзіна правільнага шляху іх няга вызваленьня, са шляху змаганьня, са шляху па якому вядзе іх кампартыя З. Б. Яны сьвядома дапамагаюць польскаму фашызму задушыць вызваленчы рух падняволенага народу. Уся іхняя дзейнасьць вядзецца ў шчыльным кантакце з адпаведнымі арганізацыямі польскай улады. Ёсьць дакумэнты, мэмарыялы лідараў хадэцыі, гэтага зборышча манархістаў, клерыкалаў, абшарнікаў, дзе яны адкрыта гавораць аб тых спосабах, якія на іхнюю думку, трэба ўжываць, каб заколыхаць клясавую чуйнасьць працоўных мас, каб прадаць іх інтарэсы польскаму фашызму. Вот хто, яны, гэтыя «культурнікі»! Вось іх палітычнае аблічча! І калі ў нас выклікае пачуцьцё абурэньня, ненавісьці і агіды зьрочная сярэднявяковая постаць польскага ката-прафэсыянала Мацыеўскага, які не ўпраўляецца вешаць засуджаных на шыбеніцы, то хто-ж такія гэтыя «культурнікі», што сваёю дзейнасьцю натхняюць катаў Мацыеўскіх, пракладваюць ім дарогу крыві—дарогу на галгофу лепшым сыном працоўных мас З. Б.?

Мой грамадзкі абавязак перад працоўнымі масамі З. Б. чыю нядолю апявала мая юнацкая муза, за чые інтарэсы я стаю і буду стаяць пад сьцягам ідэалаў камунізму, прымушае заявіць гэтым палітычна збанкрутаваным людзям: Вы сьвядома забіваеце жывыя струмені народнага руху, вы гасіце агонь змаганьня, агонь сацыяльнага вызваленьня працоўных мас, без чаго ня можа быць вызваленьня нацыянальнага. Вы прадаеце працоўныя масы акупаванай Беларусі ў нацыянальную і сацыяльную няволю польскаму фашызму. На вашай адзежы кроў лепшых сыноў беларускага народу. Не спэкулюйце маім імем у вашых рэакцыйных і контр-рэвалюцыйных мэтах!

Таксама я лічу сваім абавязкам перасьцерагчы моладзь З. Б., моладзь папаўшую пад уплыў хадэцыі, не ставіцца на той шлях, на які клічуць яе ідэолёгі хадэкаў. Няхай узважыць яна чульліваю вагою маладога розуму і чыстых парываў юнацкага сэрца той «духоўны хлеб», што падносяць ёй хадэкі рукамі ксяндза Станкевіча. Я веру, што гэтыя парывы маладога сэрца дапамогуць ёй выблутацца з павуцьця хадэцкай і нацыянал-здрадніцкай рэакцыі і шчыльна ўліцца ў рады працоўных мас, каб ісьці з імі ў ногу пад кіраўніцтвам кампартыі ЗБ па адзіна вернаму і правільнаму шляху клясавага змаганьня супроць нацыянальнай і сацыяльнай няволі.

Канчаючы свае слова, я зварочваюся з заклікам да пісьменьнікаў: т. т. пісьменьнікі, маладая зьмена! Вашы літаратурныя здабыткі вялікія і цэнныя, але не заспакойвайцеся на іх. Вялік яшчэ і рахунак, які прад'яўляе нам пісьменьнікам, наша вялікая гістарычная эпоха, і гэты рахунак яшчэ далёка намі не аплачаны. Прыложым яшчэ больш намаганьня, яшчэ больш клясавай чуйнасьці, яшчэ цясьней згуртуемся навокал камуністычнай партыі і цалкам аддамо сваю музу справе сацыялістычнага будаўніцтва, справе абароны нашай краіны, справе пабудовы бясклясавай грамады.

Няхай жыве і квятнее наша моладзь! Няхай бурліць маладое радаснае жыцьцё! Няхай жывуць будаўнікі гэтага новага, здаровага сацыялістычнага жыцьця і іх кіраўнік—камуністычная партыя!

Я. Колас.

## На юбілейным вечары

Вялізарная аўдыторыя сабралася 15 сьнежня ў Беларускім Дзяржаўным тэатры сьвяткаваць 50-ці гадовы юбілей народнага паэта Беларускай Савецкай Сацыялістычнай Рэспублікі—Якуба Коласа. На сьвяткаваньні—рабочыя, пісьменьнікі, настаўнікі, навуковыя работнікі самая разнастайная публіка, якая выразна сьведчыць пра вялізарную папулярнасьць Якуба Коласа.

Урачысты вечар адкрывае Наркамасьветы тав. **Платун**, які спыняючыся на вялізарнай літаратурнай і грамадзкай дзейнасьці Якуба Коласа перадае юбіляру прывітаньне ад Наркамасьветы:—Жадаем-жа нашаму дарагому юбіляру—народнаму паэту Якуба Коласу яшчэ шмат гадоў працаваць на справу будаўніцтва культуры, нацыянальнай па форме і сацыялістычнай па зьмесьце.

У залі—авацыя. Гэта выбіраецца ў прэзыдыум юбіляр Якуб Колас. За сталом прэзыдыуму Янка **Купала, Горын, Клімковіч, Замоцін, Платун Рак-Міхайловскі, Лынькоў, Чарот, Мятла, Галавач, Харык,** прадстаўнікі заводаў, чырвонаармейскіх часьцей. настаўніцтва.

З вялізарным дакладам пра творчы шлях юбіляра выступае т. **Л. Бэндэ.**

Творчы шлях Якуба Коласа мае цэлы шраг выдатнейшых старонак адзначаных рэвалюцыяй 1905 г., адзначаных барацьбой супроць царскага самаўладзтва, за сацыяльнае і нацыянальнае вызваленьне Беларусі. Перамогшы нацыяналістычныя памылкі Якуб Колас падышоў цяпер пры савецкай уладзе да вялізарных мастацкіх абагульненьняў, якімі зьяўляюцца яго творы «На прасторах жыцьця», «Адшчапенец». ды інш. Мастацкае слова паэта гучыць гнетам пратэсту супроць сацыяльнага і нацыянальнага прыгнету Заходняй Беларусі.

Пасьля дакладу з прамовамі выступаюць прэзыдэнт Акадэміі Навук БССР тав. **Горын**, Адказны сакратар Аргкамітэту ССП БССР тав. **Лынькоў, Яўрэйскі паэт Ізі Харык, т. Мятла** ды інш. На імя юбіляра атрыманы прывітаньні ад газэты «Известия», аргкамітэтаў ССП, Украіны, РСФСР і Грузіі, ад Бруно **Ясенскага** ды інш.

Народны паэт Рэспублікі Янка КУПАЛА чытае верш, прысьвечаны Якубу КОЛАСУ.

Вялізарным рэвалюцыйным патасам, выключнай шчырасьцю адзначаецца адказная прамова Якуба **Коласа**, якая зьяўляецца магутным доказам таго, што лепшая частка старой інтэлігенцыі, лепшым з лепшых прадстаўнікоў якой зьяўляецца Якуб КОЛАС, цалкам гатовы адаць свае сілы справе сацыялістычнага будаўніцтва, якое праводзіцца пад кіраўніцтвам Ленінскай партыі.

Пасьля ўрачыстай часткі адбыўся канцэрт, складзены пераважна з твораў Якуба Коласа. Асаблівай увагі заслугоўвае паэма «Калгаснае», прачытаная акторамі БДзТ-І.

Б.

## Прамова адказнага сакратара ССПБ т. М. Лынькова

Дазвольце мне ад імя Аргкамітэту Саюзу Савецкіх пісьменьнікаў БССР і ад імя ўсяе нашае пісьменьніцкае грамадзкасьці перадаць шчырае, гарачае прывітаньне—народнаму паэту Савецкай Беларусі ЯКУБУ КОЛАСУ з прычыны пяцідзесяцігодзьдзя яго нараджэньня.

Прывітаньне вам, ЯКУБ КОЛАС, аднаму са старэйшых нашых пісьменьнікаў, якія прайшлі суровую жыцьцёвую школу, якія выступілі творцамі—мастакамі ў беспрасьветныя годы царскай рэакцыі, царскага самаўладзтва. І калі гэтая суровая школа, калі гэтыя беспрасьветныя дні для нас, для маладзейшых, зьяўляюцца ня больш, ня менш, як гісторыяй, гістарычным мінулым, непасрэдна намі не перажытым, то для вас, ЯКУБ КОЛАС, гэтая гісторыя—жывыя, балючыя ўспаміны ўчорашняга царскага дню, успаміны, зьвязаныя з турмой, зьдзекамі, катаваньнямі, безшабашным разгулам паліцэйскага бізуна і казацкай нагайкі на былых, так званых імпэрскіх акраінах.

Вы больш паловы свайго жыцьця шукалі мастацкім словам чалавечую праўду, тую вышэйшую праўду, зьмест якой залежыць ад таго, хто марыць аб ёй. Часам гэтая праўда гарэла фээрычным бляскам дэмакратычных ілюзій, сьветам падрумяненых ідэалістычных ісьцін, часам ахіналася яна ў атрутную бутафорыю нацыяналістычных—«свабод» і імкненьняў. Але трэба сказаць, што прайшоўшы суровую школу жыцьця, падзяліўшы з усімі працоўнымі шляхі барацьбы за сацыяльна-нацыянальнае вызваленьне, будучы шчыльна-зьвязаны з найлепшымі рэвалюцыйнымі элемэнтамі нацыянальна-вызваленчага руху вы здолелі знайсьці, зразумець і ацаніць самую найвялікшую, самую найвысокую праўду—суровую праўду пралетарыяту, праўду дыктатуры пралетарыяту. Тую праўду, якая нясе шчасьце і радасьць большай частцы людзей, тую праўду, з якой нараджаецца новае чалавецтва. Тую праўду, якая ня любіць ілюзорных ісьцін, бутафорскіх фээрый, якая паважае толькі суровую рэчаіснасьць і непахісную волю працоўных да перамог і змаганьня.

Да гэтай праўды вы прышлі. Вашы апошнія творы—яскравыя сьведкі гэтаму. Ваша творчасьць—наш агульны здабытак у скарбніцу беларускай савецкай літаратуры, літаратуры заклікай быць верным памочнікам камуністычнай партыі і савецкай улады. І мы ўпэўнены і горача пераконаны ў тым, што ЯКУБ КОЛАС дасьць яшчэ нашай пралетарскай грамадзкасьці не адну аповесьць, не адзін раман, не адну паэму, якія ўслаўляць шырачэзныя прасторы нашага жыцьця, пакажуць ва ўсёй велічы гэраізм, адвагу, энтузіязм шматмільённай арміі адданых змагальнікаў за сацыялістычнае сёньня і заўтра.

Мы заклікаем малодшае пакаленьне пісьменьнікаў вучыцца ў ЯКУБА КОЛАСА майстэрству мастацкага слова, вучыцца прастаце і папулярнасьці яго мовы, зразумелай для мільёнаў, вучыцца эканоміі мастацкіх сродкаў, той разумнай эканоміі, з якой дасягае пісьменьнік і паэта выключнай выразнасьці і высокай вобразнасьці свайго слова. Мы заклікаем маладых таварышоў вучыцца прастаце і папулярнасьці яго пыту яго актыўнай грамадзкай работы. ЯКУБ КОЛАС ня толькі паэта і пісьменьнік. Ён на сёнешні дзень і актыўны ўдзельнік непасрэднай практычнай работы, работы на адказнейшым фронце нашага культурнага будаўніцтва, работы ў Акадэміі Навук Беларусі.

Няхай жыве наша беларуская савецкая літаратура, юбілеямі двух слаўных паэтаў- Купалы і Коласа—падагуліўшая свае пераможныя шляхі!

Няхай жыве юбіляр—Якуб Колас!

Няхай жыве Ленінская Камуністычная партыя, пад кіраўніцтвам якой беларускія працоўныя масы дасягнулі ня бывалага росквіту свае гаспадаркі і свае культуры.

(Партрэт работы мастака В. Волкава)

ЯКУБ КОЛАС

## Прамова прэзыдэнта Беларускай Акадэміі навук т. Горына на вечары, прысьвечаным 50-гадоваму юбілею Якуба Коласа

На юбілеях звычайна прынята гаварыць прыемныя рэчы. Але я думаю ніхто з прысутных ня зможа супярэчыць, што т. Я. КОЛАС сапраўды **буйная колёрытная фігура ў беларускай літаратуры,** адзін з яе заснавальнікаў, вялікі майстра мастацкіх лірычных і эпічных твораў. Мне думаецца, што Я. КОЛАС і Я. КУПАЛА ў стварэньні літаратурнага стылю нашай беларускай літаратуры займаюць такое-ж месца, як ў рускай Пушкін, Лермантаў, Гогаль. Зараз асабліва відаць, як мала меў рацыі Максім Багдановіч, які ў «нашаніўскіх» аглядах недаацэньваў Я. КОЛАСА, лічачы яго толькі беларускім Нікіціным.

У сваім выступленьні я хацеў-бы спыніцца толькі на адным пытаньні: што дало такую сілу Я. КОЛАСУ, якая падняла яго на вяршыны нашай беларускай літаратуры? Мне здаецца, сіла Я. КОЛАСА ў тым, што ён, як губка ўсмактаў у сябе думы і пакуты нашага ва ўмовах самаўладзтва прыбітага, разбуранага нацыянальна-прыгнечанага селяніна, які толькі ва ўмовах дыктатуры пралетарыяту пачаў адчуваць радасьць жыцьця.

Сапраўды, калі гістарычна прасачыць творчасьць Я. КОЛАСА, дык у ёй як у люстры знайшлі адбітак гаркія думы нашага бедняка і серадняка, прыгнечанага абшарнікамі і буржуазіяй З малаком маткі Я. КОЛАС ўвабраў у сябе ненавісьць да самаўладзтва і памешчыкаў. Вось што, напрыклад, Я. КОЛАС пісаў некалькі гадоў таму назад ў сваёй аўтабіяграфіі: З самага раньняга дзяцінства закрадалася ў душу варожае пачуцьцё да паноў, а з часам яно яшчэ больш узмацнілася.

**Гэта нянавісьць** да памешчыкаў сапраўды знаходзіць свой адбітак ў ранейшых работах Я. КОЛАСА. Вазьміце, напрыклад, надрукаваны ў 1906 годзе яго першы верш «Наш родны край». Чытаючы яго, адчуваеш, што паэта гаворыць словамі прыбітага і прыгнечанага беларускага селяніна. Тыя-ж матывы востра выяўлены і ў творах «Жніво», «Вёска» і інш.

Я не зьбіраюся гістарычна прагледзець творчасьць Я. КОЛАСА. Вядома, што на пэўных этапах глыбокія хістаньні западалі ў душу паэты, але як прадстаўнік тых сацыяльных пластоў, з якіх ён вышаў, Я. КОЛАС знаходзіў у сабе сілу перамагаць іх, каб разам з пралетарыятам весьці барацьбу за сацыялізм.

Кастрычніцкая Рэвалюцыя невыпадкова правяла вострую грань у творчых матывах паэт... Сэнс яго творчасьці ўжо другі. Дыктатура пралетарыяту, якая забясьпечыла працоўнаму сялянству зьнішчэньне памешчыцкай кабалы і нацыянальнага прыгнечаньня, стварыла ўсе ўмовы для магутнага разьвіцьця творчасьці Я. КОЛАСА. Гэта ясна ўсьведамляе і сам Я. КОЛАС «Беларуская культурная справа, з якой я азнаёміўся па прыезьдзе ў Менск (1921 год П. Г.) і яе пэрспэктывы пры савецкім урадзе на мяне зрабілі найлепшае ўражаньне, і я прыйшоў да такога перакананьня, што ні пры якім іншым урадзе ў цэлым сьвеце нацыянальная культура і справа адраджэньня прыгнечаных нацый не пастаўлены і ня могуць быць пастаўлены ў такія спрыяючыя ім ўмовы, як пры Савецкай уладзе».

Сапраўды, толькі ва ўмовах савецкай ўлады Я. КОЛАС поўнасьцю разгарнуў свае творчыя сілы, узбагаціўшы нашу літаратуру новымі высокамастацкімі творамі.

Я ні ў якай меры не дапушчаю думкі, што ў нашыя дні ўжо можна падвесьці вынікі творчасьці Я. КОЛАСА. Я. КОЛАС зараз у поўным росквіце сваіх сіл. Рашучая перабудова аднаасобнай карлікавай сялянскай гаспадаркі на сацыялістычны шлях, барацьба бядняцка-серадняцкіх мас за калектывізацыю, як адзіную форму зьнішчэньня шматвяковага прыгнечаньня сялянскіх мас, адкрываюць новыя палотны для творчасьці Я. КОЛАСА. КОЛАСАМ ўжо дадзены першыя нарысы гэтага новага этапу ў яго творчасьці. Я думаю, што многім ужо вядомы калгасныя творы паэта, якія ён зьмясьціў яшчэ ў 1930 годзе у «маладняку» (№ 3).

У вершы «Старая вёска» Я. КОЛАС заклікае да рашучай барацьбы з гэтай вёскай.

**Чаго жалець табе гаротнай?**
**Загонаў, дзе цьвіцё сурэпа,**
**Смыхі, сахі, сярпы і цэпа,**
**Каб так чапляцца за іх сьлепа?**
**Пара іх кінуць беззваротна!**
**Зірні наперад зоркім вокам,**
**У наша сеньнешняе раньне...**
**Вітай для новага сьвітаньня,**
**Ідзі машынам на спатканьне,**
**Ды грамадою, цьвёрдым крокам!**
**«Мая зямля», «мой поплаў», «паша»,**
**«Мой луг», «мой конь», «мае каровы»—**
**зьлінялыя, старыя словы!**
**Пара даць сэнс ім новы:**
**Зьменіць іх час на «наш» і «наша»!**

У вершы «Серадняк» Я. КОЛАС высьмейвае хістаньні серадняка і ў высока-мастацкай форме раскрывае, што толькі цемра і несьвядомасьць затрымлівае некаторых сераднякоў ад уступленьня ў калгас.

Творы напісаныя Я. КОЛАСАМ у апошнія два гады—гэта бадзёры прызыў да новага калектыўнага жыцьця. У сваіх творах КОЛАС ніколі не забывае і сваіх братоў, пралетарыят і працоўнае сялянства Заходняй Беларусі, якія адчуваюць на сябе жахі прыгнечаньня польскага і беларускага пана і кулака. Я думаю, далёка не выпадкова, што іменна ў дзень свайго юбілею сёньня Я. КОЛАС апублікаваў свой новы твор пра Заходнюю Беларусь. Гэта лепшы адказ беларускім рэнегатам Луцкевічам, Багдановічам, Чарнецкім, Астроўскім, якія ліжуць абцасы польскага пана. Яны таксама нядаўна сьвяткавалі юбілей Я. КОЛАСА, дзе стараліся ачарніць сапраўдны твар нашага народнага паэта. Ня так даўно у «Кур'еры Віленскім» была зьмешчана нататка, як праводзіўся юбілей Я. КОЛАСА ў Вільні. Нафуфыраныя польскія і беларускія пані слухалі даклады махровых рэакцыянэраў Чарнецкага і Багдановіча. Але-ж ніякія хлусьня паноў Чарнецкіх і Багдановічаў ня зьменшыць ролю Я. КОЛАСА, як песьняра працоўнага беларускага селяніна, які пад кіраўніцтвам пралетарыяту вядзе барацьбу за калектывізацыю і да глыбіні душы ненавідзіць польскіх акупантаў, зьнішчальнікаў беларускай культуры.

У заключэньні дазвольце выказаць упэўненасьць, што Я. КОЛАС і далей будзе ісьці ў першых радох і рашуча змагацца за сацыялізм.

50 год засталі Я. КОЛАСА у поўным росквіце яго сіл. Невыпадкова, калі ён даведаўшыся, што зьбіраюцца сьвяткаваць яго 50-годзьдзе, ён зьнёсься да гэтага некалькі іранічна, бо на справе ён адчувае сябе маладым, быццам яму не 50 год, а ўсяго толькі два разы па 25. Працуючы на працягу гэтых двух год у Акадэміі разам з Я. КОЛАСАМ, я заўсёды прыслухоўваюся, захапляюся яго высокай культурнасьцю, аграмаднай воляй і працаздольнасьцю. Асабліва прыемна бачыць у ім б'ючае жывой крыніцай імкненьне наперад. Не дарма Э. Золя у сваім творы «Доктор Паскаль» гаворыць, што «адзінае шчасьце жыцьця—гэта бязупыннае імкненьне наперад». Гэтым шчасьцем уладае Я. КОЛАС, у гэтым бязупынным рэвалюцыйным імкненьні ўперад—зарука далейшага разьвіцьця творчасьці Я. КОЛАСА, зарука яго шчыльнай сувязі з пралетарыятам, зарука яго барацьбы з усімі тымі, хто перашкаджае будаўніцтву сацыялізму.

## Таварыская сустрэча

Пасьля агульнагарадзкога вечару, прысьвечанага 50-ці годзьдзю з дню нараджэньня народнага паэта рэспублікі Якуба Коласа, 19 сьнежня ў Доме Пісьменьнікаў адбылася таварыская сустрэча юбіляра з пісьменьнікамі і рабочымі-ўдарнікамі заклікаными ў літаратуру.

Таварыская сустрэча Якуба Коласа з пісьменьнікамі была адкрыта уступнай прамовай старшыні Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў т. Клімковічам, які даўшы характарыстыку творчага шляху Якуба Коласа, галоўным чынам спыніўся на праблеме ленінскага аўладаньня культурнай спадчынай маладымі савецкімі пісьменьнікамі БССР, заклікаючы да вучобы, крытычнага аўладаньня спадчынай.

Паэта Крапіва ў сваім выступленьні адзначыў, што творчасьць Якуба Коласа мела вялікі ўплыў у першыя гады яго творчай работы, першымі радкамі паэтычнага ўспрыняцьця рэчаіснасьці былі радкі паэзіі Коласа, у якіх Крапіва знайшоў сынтэзаванае асмысьленьне эпохі часоў царскай рэакцыі і беспрасьветнага ўціску.

Рэзка выступіўшы супроць існуючага ў пісьменьніцкіх колах лёзунгу—«пісьменьнік—на службу сацыялістычнаму будаўніцтву»,—Платон Галавач лічыць, што наш савецкі сучасны пісьменьнік, не служыць рэвалюцыі, а актыўна ўдзельнічае ў сацыялістычным будаўніцтве, зьяўляючыся як і кожны рабочы—актыўным удзельнікам пабудовы бясклясавай, сацыялістычнай грамады.

Адзначыўшы вялізэзны, як якасны так і колькасны рост беларускай савецкай літаратуры ў 1932 годзе, што зьявілася вынікам пастановы ЦК Усе КП(б) ад 23 красавіка г. г., П. Галавач заклікае маладых пісьменьнікаў да яшчэ большага адчуцьця адказнасьці за сваю творчую прадукцыю і лічыць, што тут маладыя пісьменьнікі можа шмат чаму навучыцца ў Якуба Коласа.

Цішка Гартны расказаў аўдыторыі пра сваё першае спатканьне з юбіляром, якое адбылося ў 1909 годзе, у Менскай турме—мяне зьдзівіла тая энэргія і бадзёры настрой арыштаванага царскай паліцыяй Якуба Коласа, які пачаў распытваць у мяне пра жыцьцё на волі, пра рэвалюцыйную работу...

Вітаючы юбіляра ад Саюзу Савецкіх Мастакоў БССР т. УСС заклікаў пісьменьнікаў вучыцца ў Я. Коласа шчырасьці ўспрыняцьця нашай рэчаіснасьці.

Т. т. Юдэльсон і Ліўшыц віталі Якуба Коласа ад імя яўрэйскіх пісьменьнікаў БССР.

З адказным словам выступіў Якуб Колас. Любоў да юбіляра выявілася ў нясьціханых воплесках.

Наша хата, хата лясьніка Наднёманьны была ў адзіноце. Лес, неба, зямля, луг,—вось акружэньне майго дзяцінства. Прырода рабіла на мяне надзвычайна вялікае ўражаньне і асабліва любоў і люблю да гэтага часу дні перад навальніцай.. Усё заціхае, зьмірае, недзе ўдалечы чутны раскаты грому...

— Вучыцца грамаце пачаў па ветхаму завету... затым у «дарэктары»... Апавяданьне лясьнікоў, начлежнікаў был. для мяне самым цікавым... Слова «паэта» трапіла ў нашую хату праз бацьку, з панскага двара і мела для мяне нейкае асаблівае значэньне...

— Маім кумірам быў Крылоў з яго басьнямі. Знаходзячыся пад яго ўплывам я пачаў пісаць сам... Друкавацца ня было дзе, і мае вершы хадзілі ў рукапісах па настаўніцтву.

— У Несьвіжы, у настаўніцкай сэмінарыі, вялікае значэньне для майго паэтычнага афармленьня меў мой настаўнік Кудрыцкі, які перачытаўшы мае першыя творы ў захапленьні сказаў:

— Вот ваша сапраўдная дарога!..

Перад маладой пісьменьніцкай аўдыторыяй праплывалі вобразы першых год творчай дзейнасьці Якуба Коласа, гэтага самародка з лясьніковай хаты, які прайшоў надзвычайна цікавы жыцьцёвы шлях, і стаўшы на сапраўдную дарогу, вырас у клясыка беларускай літаратуры, акадэміка і народнага паэту Рэспублікі.

Сустрэча Якуба Коласа з пісьменьнікамі скончылася пажаданьнем юбіляру ад імя Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў:

— Быць і на працягу другой паловы свайго жыцьця паэтам навальніцы, актыўным удзельнікам пабудовы бясклясавага сацыялістычнага грамадзтва.

Bela.

## Над чым працуюць пісьменьнікі

**Янка Купала**—перакладае з украінскай мовы «Кабзар»—Т. Шэўчэнкі.

**Пятрусь Броўка** напісаў нізку вершаў «Любые мае таварышы», якія будзе друкаваць у часопісі «Полымя Рэвалюцыі». Гэтымі днямі выяжджае ў Ленінград на кіно-фабрыку «Савецкая Беларусь», дзе будзе працаваць над сцэнарыям па сваёй аповесьці—«Каландры».

**Сымон Баранавых** здаў у ДзВБ зборнік апавяданьняў «Пасярэдзіне дарогі». Піша раман, які будзе адбіваць перыяд імпэрыялістычнай і грамадзянскай вайны на Беларусі.

Перакладае другі том. М. Горкага на беларускую мову (апавяданьні).

**Рыгор Кобец** піша п'есу «Жанчына». Працуе над сцэнарыем па раману і п'есе «Бацькаўшчына« Кузьмы Чорнага.

**Васіль Сташэўскі** здаў у часопіс «Полымя Рэвалюцыі» п'есу «Амэрыка». Напісаў некалькі невялічкіх апавяданьняў, частка якіх будзе друкавацца ў часопісі «Чырвоная Беларусь».

**Рыгор Мурашка** скончыў кіно-сцэнары па раману «Сын». Працуе над новым раманам.

**Ст. Шушкевіч** здаў у Дз. В. Б. зборнік вершаў, які ўжо прыняты да друку. Працуе над нізкай гумарэсак «Дзёньнік Разекі».

Ул. СОКАЛАЎ

# Мастакі на пятай усебеларускай

V-я Ўсебеларуская мастацкая выстаўка па фармальнай якасьці, па глыбіні пастаўленых тэматычна-ідэёвых праблем у жывапісі, скульптуры, графіцы і інш., стаіць на значна большай вышыні, чым IV мастацкая выстаўка. Гэта гаворыць за пэўны паварот мастакоў БССР да праблем сучаснасьці, да больш глыбокага асэнсоўваньня зьяў і паказвае на жаданьне падаць вобраз не ў пасыўнай павярхоўнай фіксацыі, а ў супярэчлівым ідэёвым раскрыцьці працэсу, гаворыць за паступовае аўладаньне імі марксыцка-ленінскім сьветапоглядам.

Мастак **Пашкевіч** выступіў з шэрагам буйных палотнаў, пераважна на тэму «партызаны». Пашкевіч адзін з буйнейшых мастакоў, але творчая актыўнасьць Пашкевіча не запальваецца такой выдатнай геройкай сучаснасьці, як ударніцтва і сацспаборніцтва, бо ён пакуль не разумее іх, а атлядаецца, на пэрыяд грамадзянскай вайны, партызаншчыну—багатых гераічнымі момантамі.

Аднак, часовае «замыканьне» Пашкевіча ў рамкі партызанскай тэматыкі зьяўляецца законамерным этапам прыходу да сучаснай тэматыкі.

Пашкевіч—рамантык; яго тэмпэрамант шукае такіх момантаў, выпадкаў, дзе-б была сьмерць, порах, кроў (невыпадкова была створана карціна «Забойства селькора» на 4-й Усебеларускай выстаўцы). Тэма «партызаншчына» запаліла яго творчую актыўнасьць сваёй гэройкай, рамантычным патасам. Пра гэта гаворыць і ягоная карціна «Партызаны за абмеркаваньнем будучай ваеннай апэрацыі», хаця тут ёсьць і элементы натуралізму (Жонка партызана).

Спроба Пашкевіча трактаваць сучасную тэму «Лесанарыхтоўка», скончылася няўдачай. Палатно «Лесанарыхтоўкі» паказвае на поўнае няведаньне мастаком спэцыфікі гэтай галіны гаспадаркі, няведаньне мэханізаваных прыёмаў, якія аблягчаюць фізычную працу чалавека. Атрымліваецца невыразны вобраз узятай тэмы, хаця напружанасьць колеру, шырыня размаху пісьма зачароўвае малападрыхтаванага гледача тэмпэраментнай формай, майстэрствам, затушоўвае тэматычныя недахопы.

Каб стаць гаспадаром становішча ў справе вострай трактоўкі праблемы сучаснасьці Пашкевічу патрэбна больш актыўна вывучаць нашу сучаснасьць.

Калі параўнаць ідэёвы і мастацкі ўзровень работ Тычыны на 4-й мастацкай выстаўцы «Укатка шасы» і цяпер на Уй Ўсебеларускай выстаўцы «Лодар на вытворчасьці», ня будзе захвальваньнем калі сказаць, што мастак Тычына ідзёва пераўзбройваецца, пачынае разумець сучасныя працэсы ў пераробцы псыхалёгіі чалавека.

Недахопам апошняга твору зьяўляецца паказ супярэчлівага моманту барацьбы на вытворчасьці з лодырам, які задуманы крыху наіўна—лодар сядзіць, а брыгада яго сароміць; прыходзіцца дагадвацца, ці ён спазьніўся на працу, ці проста любіць пасядзець у час работы (не паказаны прычыны). Адчуваецца недадуманасьць гэтага вобразу.

З усіх выстаўленых на гэтай выстаўцы работ, асабліва ўражаньне робіць мастацкі твор Ахрэмчыка—«Другі зьезд РСДРП», ці больш правільна—«Раскол на II-м зьезьдзе».

Гэта першая спроба мастака на аснове глыбокай прапрацоўкі гісторыі партыі стварыць вобраз гістарычнага зьезду.

У гэтым творы агульны калёрыт, кампазыцыя з густа разьмешчаных сьветавых удараў першага і другога пляну нагадваюць канспіратыўную абстаноўку, у якой адбываўся гэты зьезд. Сьветавыя ўдары выпукляюць асноўныя групы бальшавікоў на чале з Леніным і адсоўваюць на другі плян ўсьцішаных фарбах групу меншавікоў.

Але гэта толькі эскіз да карціны, які можа быць пераробланы некалькі разоў—справа грамадзкай крытыкі дапамагчы мастаку Ахрэмчыку выправіць недахопы ў вырашэньні гэтай складанай тэмы.

Мэтад Ахрэмчыка для стварэньня мастацкага твору,—лінія найбольшага супраціўленьня, гэта ня ёсьць эмпірычнае сьлізганьне на паверхні зьяў, як, напрыклад, у мастакоў Красоўскага, Кастэлянскага. Віера і інш.



Карціна мастака ГАЎРЫЛЕНКІ

Выступленьне на выстаўцы мастака Семашкевіча ўнесла ажыўленьне ў агульны шэравата-зеленаваты тон, у якім вытрымана большасьць карцін, сваею сьвежасьцю і яркасьцю чыстага незасьмечанага колеру. Індывідуальнасьць яго рэзка адрозьніваецца ад іншых мастакоў. Выклікае зьдзіўленьне надзвычайная пладавітасьць гэтага здольнага мастака, які за кароткі адцінак часу пасьля сваёй індывідуальнай выстаўкі і да У-й Ўсебеларускай стварыў шэраг новых твораў на тэму: «Заходняя Беларусь».

Прычына такой «скоропостижности» у прадукцыі мастацкіх твораў Семашкевіча тлумачыцца яго недастаткова высокім ідэёва-культурным узроўнем, ня здольнасьцю асэнсоўваць мастацкі вобраз ва ўсёй яго складанасьці.

Захвальваньне Семашкевіча, што мела месца ў артыкуле тав. Салагуба, прынесла яму мала карысьці.

Выступленьне мастака Касталянскага (жывапісца і тэарэтыка) не дае ўзору як трэба задумваць тэму і падыходзіць да мастацкага вырашэньня яе.

Яго твор «Брыгада заводу Варашылава»—пасыўная фіксацыя вытворчага працэсу.

Мастак Забораў імкнуўся разгарнуць цікавую тэму «Новыя людзі і новы горад», даць жыцьцёрадасны сьвежы калёрыт, але атрымалася саладкая прытарнасьць колеру, карціна нагадвае хутчэй «Новы Ерусалім. Выводзіць з непаразуменьня толькі плаціна Днепрабуду, — яна выцягвае зьмест гэтай карціны з біблійскага часу.

Мастак Гаўрыленка ў сваім творы імкнуўся перадаць патас рэвалюцыйнага сьвята і гэтае яму амаль удалося. Твор авалодвае ўвагай гледача, але вялікі недахоп гэтага твору ў кепскай прарысоўцы фігур і выхалашчанасьці ўсякага асмысьленага выразу на «каменных» тварах передавой групы, што і зьнішчае агульны эфэкт.

Карціна мастака ТЫЧЫНЫ

Трэба адзначыць здольнага мастака Красоўскага, які пачаў дасягаць досыць высокага майстэрства ў жывапісе, але і ён хварэе агульнай хваробай—нэйтральнасьць сужэту, смакаваньне выключна жывапіснага матэр'ялу. Выключэньнем зьяўляюцца партрэты ўдарнікаў, якія добра прарысаваны, з досыць высокай жывапіснай насычанасьцю.

Неабходна адзначыць яшчэ гравюры Мініна, творы мастакоў Даўгялы, Завішшы, Даркевіча, Кругера і інш.

Ня поўна паказалі свой творчы твар скульптары Бразэр і Азгур, якія выставілі выключна партрэты і па гэтаму нельга гаварыць на колькі яны спраўляюцца з сучаснай тэмай. Можна толькі гаварыць, як яны спраўляюцца з задачай сучаснага скульптурнага партрэту.

Пры вырашэньні скульптурнага партрэту грамадзкага дзеяча—мастак Бразэр выпукляе біялёгічныя асаблівасьці арыгіналу, ставячы партрэтнае падабенства самамэтай, выключаючы ўсякі псыхалёгізм, сувязь унутранага зьместу індывідыўма з навакольным сацыяльным асяродзьдзем.

У партрэтах Азгура адчуваецца глыбокае асэнсоўваньне месца індывідыума ў сацыяльным асяродзьдзі. Гэта дадатны бок творчасьці аўтара (партрэты Кузьмы Чорнага і Цішкі Гартнага).

Недахопам творчасьці Азгура зьяўляецца празьмерная псыхалёгічная падкрэсьленнасьць і напружанасьць твару партрэтаў, што іншы раз мяжуе з грымасай (Ц. Гартны).

Грубэ выступіў з творам на шырокую тэму «Кастрычнік». Барыкадны бой выяўлен нядастаткова.

Дадатны бок работы Грубэ—гэта імкненьне даць разгорнутую тэму рэвалюцыйных падзей.

## Новы цэнтр мастацтвазнаўства ў Маскве

Народны Камісар Асьветы РСФСР т. Бубноў атрымаў ад групы працаўнікоў мастацтва і літаратуразнаўства ліст з просьбаю арганізаваць у Маскве Ўсерасійскі цэнтр мастацтвазнаўства — Акадэмію Мастацтвазнаўства. Ліст падпісалі: народны артыст Качалаў, гэжысёр Пудоўкін, акадэмікі Разанаў і Жалтоўскі, мастацтвазнавец Волкаў, Вродскі і інш. Пра гэта-ж у Наркамасьветы паступілі лісты ад Варнітсо, і праф. Сокалава.

Спэцыяльная нарада пры сэктары навукі палічыла неабходным стварыць у Маскве мастацтвазнаўчы інстытут і навукова - мастацтвазнаўчае таварыства, якія-б распрацоўвалі ўсе пытаньні мастацтва.

Для арганізацыі інстытуту і таварыства нарада абрала камісію. У яе ўвайшлі: т. т. Л. Т. Аксэльрод, Бродскі, Сокалаў, Верасаёў, Яфрэмін, Ярмілаў, Нусінаў, Лебедзяў, Палянскі і інш.

## У Дзяржаўным Выдавецтве Беларусі

Сэктар ЛІМ Дз. В. Б. мяркуе ў наступным годзе выдаць каля 200 назваў арыгінальнае і перакладной літаратуры. Кнігі будуць выходзіць сэрыямі: «У дапамогу літгурткам» «Бібліятэка для малапісьменных», «Школьная сэрыя», «Сусьветная клясычная літаратура», «Клясыкі сусьветнай літаратуры ў школе», «Тэатр, кіно, мастацтва», «Музычная літаратура».

З арыгінальнай літаратуры выйдуць наступныя:

**ПРОЗА:**

**Астапенка.** Вызваленьне слі (раман); **Ц. Гартны**—Збор твораў, т. V і зборнік апавяданьняў; **М. Гельфер**—Волат (апавяданьні); **З. Бядуля**—Збор твораў, т. II; **П. Броўка.** Сэзоньнікі (аповесьць); **П. Галавач.** Праз гады (раман); **М. Лынькоў.** На чырвоных лядах (раман), зборнік апавяданьняў, аповесьць «Апошні зьвярыядавец»; **Я. Колас.** Збор твораў т. т. III і IV; **Я. Ліманоўскі.** Апавяданьне; **М. Багун.** Ворагаў твар (апавяд.); **Ц. Зарэчны.** Белы камень (аповесьць); **В. Каваль.** Дзень палымнее (аповесьць); **Я. Скрыган.** Смага (аповесьць); **К. Чорны.** Люцыя невада (аповесьць); **М. Нікіцін.** Жыцьцё (аповесьць); **Я. Нёманскі.** Драпежнікі; **К. Чорны.** Збор твораў т. I.; **М. Лужанін.** Канцы прозы; **А. Оршын.** Апавяданьні; **Х. Шынклер.** Сонца пад шпалы (аповесьць); Зборнік «11 ліпень»; **С. Баранавых**—Мураўейнікі; **Р. Мурашка.** Сын; **В. Сташэўскі** Шуміць бярэзінка. Пад местачковым месяцам (аповесьць).

**ПАЭЗІЯ:**

**А. Александровіч** «Чатыры паэмы»; Зборнік вершаў; **П. Глебка.** Чатыры кірункі вятроў; **З. Астапенка.** Як шум дажджу; **Ю. Таўбін.** Лірыка, эпос; **П. Трус.** Поўны збор твораў; **Я. Купала.** Выбраныя вершы; **П. Броўка.** Зборнік вершаў; **З. Бядуля.** Збор твораў т. I; **Крапіва.** Збор твораў т. I; **Ул. Хадыка.** Глыбокая рочаіць; **А. Ушакоў** Зара ва вагранак; **Т. Кляшторны.** Нашы дні. **В. Маракоў.** Права на зброю; **А. Куляшоў.** Вершы: **М. Хведаровіч.** Вершы: **С. Шушкевіч.** Паходня; **М. Лужанін.** На пункце высьпяваньня рэчаў; **Цётка.** Поўны збор твораў; **М. Чарот.** Босыя на вогнішчы; **М. Лужанін.** Новая паэма; **А. Дудар.** Новыя вершы; **М. Хведаровіч**—Вайна за мір.

**НАРЫСЫ:**

**П. Глебка.** На берагох рэк; **С. Знаёмы.** Ганчары; **М. Хведаровіч**—Нарысы; **Я. Каплан**—Нарысы пра Біра-Баджан.

**КРЫТЫКА, ТЭОРЫЯ, ГІСТОРЫЯ ЛІТАРАТУРЫ**

Зборнікі «Нарысы па гісторыі Бел. Літаратуры». **М. Аляхновіч.** Літаратурны рух на БССР. **А. Кучар.** Вялікая перабудова. **Я. Бронштэйн.** Да праблемы ленінскага этапу ў літаратуразнаўстве; **Старавойтаў, Паўлоўскі, Аляхновіч.** Ленін пра літаратуру; **М. Аляхновіч.** Літаратурная Беларусь (аўтабіяграфіі сучасных пісьменьнікаў з бібліяграфічным паказьнікам.); **А. Барычэўскі.** Артыкулы пра Заходня Эўроп. літаратуру Біа-біяграфічны зборнік.

## У аргкамітэце ССП РСФСР

▲ 11 сьнежня Аргкамітэтам ССП быў арганізаваны вечар французкай літаратуры. З вялікім дакладам пра мастацтва і літаратуру сучаснай Францыі выступіў Вайян-Куцюр'е. На вечары чыталі свае творы паэты АРАГОН, Вайян-Куцюр'е. Чыталіся ўрыўкі з твораў Анры-Барбюса і Ромэн Роляна.

▲ Творчасьці паэта Б. Кавынёва быў прысьвечаны вечар 13 сьнежня. Дакладчык тав. Семёнаў разглядзіў ідэёва—тэматычныя памылкі (Сьляпое насьледваньне Ясеніну, Гумілёву, Блоку) У творах апошняга пэрыяду, па думцы дакладчыка, паэт ўзыходзіць на верны шлях.

▲ Брыгада пісьменьнікаў—В. Казін, В. Папоў, Г. Саньнікаў, П. Скосыраў і Д. Стонаў—ўлетку бягучага году працавалі ў Казакстане. Рэзультаты творчае паездкі—вершы, песьні—чыталіся 14 сьнежня на творчым вечары пісьменьнікаў,—краязнаўцаў ССП.

▲ 73 пісьменьнікі ў якасьці кіраўнікоў літгурткоў прымацаваны Аргкамітэтам да заводаў і фабрык Масквы. У гэтым ліку—т. т. Герасімаў, Лідзін, Ясенскі, А. Вясёлы, Абрадовіч, Ляшко, Дзямідаў, Макар Пасынак, Рамнаў і інш.

▲ 5 творчых брыгад—паэты празаікі, крытыкі, драматургі, сатырыкі і гумарысты—прыступілі да работы. Заняткі адбываюцца раз у дэкаду. У брыгадах аб'яднаны пачынаючыя пісьменьнікі і паэты, што перарасьлі рамкі літгурткоў.

В. ВОЛЬСКІ

# Герхарт Гаўптман

## (Да 70-цігодзьдзя са дню нараджэньня)

У Нямеччыне з вялікай урачыстасьцю праведзена нядаўна грамадзкае сьвяткаваньне 70-ці годзьдзя з дню нараджэньня аднаго з буйнейшых нямецкіх драматургаў і пісьменьнікаў—Герхарта Гаўптмана.

Першыя—калі ня лічыць ранейшых, юнацкіх яго твораў «Лёс Праметыдаў» (Das prometheidenlos) 1885 г.) і «Тыбэрыус», зьнішчаных самім аўтарам—драма Гаўптмана «Перад усходам сонца» (Vor Sonnenaufgang) пастаўленая ўпяршыню 20 кастрычніка 1889 г. Лесінг-тэатрам ў Бэрліне, мела на сцэне вялікі посьпех. З гэтага часу Гаўптман працуе амаль выключна ў галіне драматургіі.

Посьпехі гэтага першага, убачыўшага сьвет рампы, драматычнага твору тлумачыцца ў значнай частцы тым становішчам, у якім знаходзілася да выхаду гэтай п'есы нямецкая сцэна. У нямецкім тэатры панавалі тады француская салённая п'еса, старадаўняя сэнтымэнтальная драма ў шылераўскім гусьце і звычайны, прымітыўны фарс. Гаўптман упяршыню даў для нямецкай сцэны праўдзівую натуралістычную драму. Усьлед за гэтым творам зьяўляецца яго «Сьвята замірэньня» (das Friedensfest), надрукаваная ў пачатку 1890 г. у часопісу «Вольная сцэна» (Die freie Bühne), і ў тым-жа годзе пастаўленая ў Лесінг—тэатры.

11 студзеня 1891 г. у тэатры «Вольная Сцэна» ставіцца п'еса Гаўптмана «Адзінокія» (Einsame Menschen), якая адразу ўваходзіць ў агульна-эўрапейскі рэпэртуар. На абедзьвех п'есах, пабудаваных на дакладным вывучэньні тэатральнай тэхнікі, адчуваюцца ўплывы Ібсэна.

Чацьвертая п'еса Гаўптмана «Ткачы» (die Weber), надрукаваная ў студзені 1892 г., прынятая да пастаноўкі ў лютым 1892 г. і выклікаўшая спэцыяльнае выступленьне міністра паліцыі фон-Кэлера ў прускім ляндтазе, была забаронена паліцыяй. Зьявіўшыся на бэрлінскай сцэне ў «Нямецкім тэатры» толькі 25 верасьня 1894 г., п'еса гэта надала аўтару сусьветную вядомасьць.

16 студзеня 1892 г. ставіцца яго камэдыя «Колега Крамптон» (College Crampton), 21 верасьня 1893 г.—«Баброваая шуба» (Der Biberpelz). 14 лістапада 1893 г. на сцэне каралеўскага тэатру зьяўляецца «Ганэлэ» Hannele Matterus Himmelfahrt). У далейшым на сцэне і ў друку зьяўляецца «Флёрыян Гэйер» (Florian Geer) — 1895 г.), «Потонувший колокол» (Die versunkene glocke) —1896 г.), «Фурман Гэншэль» (Fuhrmann Henchel)—1898 г.), Міхаэль Крамэр» (1900 г.), «Шлюк і Яў» (1900 г.), «Бедны Гэнрых» (1902 г.), «Роза Бэрнд» (1903 г.) і інш. У 1912 г. Гаўптман атрымаў Нобэлеўскую прэмію.

Асноўнымі творамі Гаўптмана зьяўляюцца, такім чынам, драмы, але адначасова з імі ён напісаў і шэраг празаічных твораў--новэля «Чыгуначны вартаўнік Тыль» (Bahnwälter Thiel) романы «Эмануэль Квінт» і «Бегства Габрыэля Шылінга» (Gabriel Schillids Flucht)

Паводле клясавай накіраванасьці сваёй творчасьці Гаўптман зьяўляецца тыповым прадстаўніком ідэолёгіі нямецкай дробна-буржуазнай інтэлігенцыі апошняй чвэрці XIX стагодзьдзя.

Драматычныя творы яго можна па дзяліць паводле фармальных адзнак на дзьве асноўныя групы п'ес: натуралістычных і сымбалістычных. Першая група складаецца з бытавых і сямейных драм, у якіх аўтар выяўляе зацікаўленасьць сацыяльнымі праблемамі і якія характэрны сваім натуралістычным імпрэсыянізмам. У гэтых творах аўтар з замілаваньнем адбівае рознастайныя, дакумэнтальна дэталізаваныя і ўдумлівыя карціны дробна-буржуазнага быту. У аснову гэтых драм пакладзена адлюстраваньне паступовая распаду ўстояў мяшчанскага жыцьця з яго спакойным і павольным дабрабытам. У ціхае, устойлівае існаваньне дробных буржуа ўрываюцца элемэнты катастрофы. Узьнікаюць невыбеглыя канфлікты. У цэнтры гэтых драм—вобраз адзінокага чалавека. які знаходзіцца ў трагічным канфлікце з абкружаючым сацыяльным асяродзьдзем.

У першы пэрыяд свайго творчага жыцьця Гаўптман уважліва знаёміцца з працамі заснавальнікаў навуковага сацыялізму К. Маркса і Фр. Энгельса, цікавіцца вучэньнем Ч. Дарвіна і знаходзіцца пад пэўнымі ўплывамі мацнеючага нямецкага соцыял-дэмакратычнага руху. Гэтым і тлумачыцца яго імкненьне надаць пэўны сацыяльны зьмест сваім раньнім творам.

Але сапраўдным сацыялістам Гаўптман ніколі не зрабіўся. Ён ніяк ня здолеў пазбавіцца ў сваёй творчасьці ад элементаў пастарскай сэнтымэнтальнасьці, ня здолеў далучыцца да ўдзелу ў арганізаванай барацьбе рабочае клясы, застаючыся ўвесь час пасыўна-сузіральным мастаком дэградуючага мяшчанства. З мяшчанскага быту бярэ ён вобразы сваіх дзейных асоб. Месца дзеі большасьці з яго п'ес не выходзіць за межы мяшчанскага асяродзьдзя.

Усе яго вобразы бязвольныя няўстойлівыя, размагнічаныя, пакорныя.

Ужо для першай, як назваў яе сам наогул уласьцівы драмам Гаўптмана. «Перад усходам сонца» характэрны ўсе тыя дасягненьні і недахопы, якія ногула уласьцівы драмам Гаўптмана.

У гэтай п'есе, на якой адчуваюцца пэўныя ўплывы «Власти тьмы» Л. Талстога, Гаўптман малюе беспрасьветную карціну сілезскай вёскі ва ўмовах мацнеючага прамысловага капіталізму. Падыходзіць ён да гэтай тэмы адлбакова: у п'есе няма адлюстраваньня становішча бядняцкай, пралетарызаванай часткі сялянства, якая працуе на рудніках, таксама як і няма супроцьстаўленьня ёй гаспадароў—уласьнікаў гэтых руднікоў. Гаўптман абмежаваўся толькі паказам маральнага распаду, разлажэньня і фізычнай дэгэнэрацыі сям'і аднаго з тых нямногіх сялян, якія выпадкова ўзбагаціліся, дзякуючы таму, што пад зямлёй на іх вучастках былі знойдзены пласты вугалю.

На фоне пасьлядоўна натуралістычных малюнкаў спадчыннага алкагалізму, тупасьці, цынічнай прагнасьці і, бессаромлівасьці, што выклікаюць са маўтоства Галены Краузе, якая шукае чагосьці лепшага, чыстага і сьветлага, Гаўптман выведзены цікавыя вобразы бясьсільных і недарэчных дробна буржуазных інтэлігентаў Альфрэда Лёта і д-ра Шымэльпфэніга. Лёт лічыць сябе сацыялістам. Абодвы яны настроены крытычна і нават апазіцыйна да навакольнай абстаноўкі, але нічога карыснага і патрэбнага зрабіць ня могуць. На справе, ня гледзячы на іх «высокія» меркаваньні, і «благародны» напрамак думак, гэта сапраўдныя мяшчане, якія засвоілі сабе некалькі непрадуманых, запазычаных, хадзячых ісьцін, страцілі глебу пад нагамі і дзеля гэтых ісьцін ня здольны бачыць жывога чалавека.

Гэтым вобразам сугучны і іншыя гэрої Гаўптмана (Іоган Фокерат з «Адзінокіх», Вільгельм Штольц з «Сьвята замірэньня» і г. д.).

У гэтых вобразах галоўны сацыяльны сэнс творчасьці Гаўптмана, ідэолёгія якога знаходзіцца пад моцнымі ўплывамі вострых адчуваньняў сацыяльнага крызісу дройнай буржуазіі.

Носьбітам аналёгічных настрояў зьяўляецца фактычна і Флёрыян Гэйер, асноўны гэрой аднайменнай драматызаванай гістарычнай хронікі з часоў сялянскай вайны і рэформацыі. У цэнтры гэтага мала сцэнічнага твору з моцнымі элемэнтамі сымболічнай романтыкі, мы знаходзім замест мастацкага адлюстраваньня пэўнага сацыяльна-гістарычнага процэсу, асабістую драму Гэйера, дваранiна-індывідуаліста, праваднра мужыцкага паўстаньня, які адарваўся ад свайго сацыяльнага асяродзьдзя, нават змагаецца супроць яго, але ня здолеў арганічна далучыцца да сялянства і застаўся не зразумелым і чужым для сялянскай масы, якой ён кіруе. Думкі ,настрої і паводзіны гэтага гэроя XVI ст. надзвычайна нагадваюць духоўны лад мяшчанскіх пэрсанажаў сямейна-бытавых драм Гаўптмана з тэматыкай XIX ст.

Такім чынам і ў асобе Флёрыяна Гэйера мы бачым толькі новы варыянт дробна-буржуазнага гэроя, уласьцівага творчасьці Гаўптмана.

Вышэй свайго клясава-абмежаванага ідэйнага ўзроўню Гаўптман ня здолеў узьняцца нават і ў такой буйной сацыяльнай драме, як «Ткачы». У аснову гэтага твору ён паклаў спробу адлюстраваць гістарычныя рэвалюцыйныя падзеі, зьвязаныя з барацьбой сілезскіх ткачоў супроць нечалавечнай эксплёатацыі з боку фабрыкантаў, у прыватнасьці—адзін з асобных момантаў гэтай барацьбы—паўстаньне ткачоў Эйлегэбірге ў Пэтэрсвальдаў і Лянгэнбіляў у 1844 г. супроць фабрыканта Цваныгэра (па п'есе Дрэйсігэр). П'еса «Ткачы» пабудавана на мастацкай апрацоўцы фактычнага матэр'ялу, запазычанага Гаўптманам з працы «Сілезскія мілярды» Вільгельма Вольфа, старога ўдзельніка рэвалюцыйнага руху і друга Карла Маркса, яко му апошні прысьвяціў першы том свайго «Капіталу».

У «Ткачах», пісаў Мэрынг», б'е праз край сапраўднае жыцьцё, бо яны напісаны з вялікім напружаньнем тонкага мастацкага пачуцьця.

Як дакладна трэ' было адцяніць і ўзважыць кожны выраз, каб нядаць драматычную сілу жанравым сцэнам! Якая патрэбна была сур'ёзная работа думкі, каб стварыць тую масу жывых, у большай частцы надзвычайна ўдалых фігур, з якіх павінны былі складацца дзейныя масы, калі яны сапраўды павінны былі быць адбіты ў драматычным руху!» [1]).

У гэтым творы Гаўптману пра сякнутаму пачуцьцём пагарды і агідасьці да сыстэмы ўціску, нажывы і вымаганьня, удалося стварыць надзвычайна моцную, хвалюючую карціну бязьлітаснай і безчалавечнай эксплёатацыі працоўных маладым яшчэ і прагным нямецкім капіталізмам.

Гэтым і тлумачыцца тая папулярнасьць, якой карысталіся «Ткачы» на савецкай самадзейнай сцэне ў пэрыяд грамадзянскай вайны і ваеннага камунізму—у часы адсутнасьці пасьлядоўна рэвалюцыйнага рэпэртуару.

Але ў п'есе няма спробы зразумець, ці растлумачыць сацыяльна-гістарычны сэнс выяўленых аўтарам здарэньняў. Праўда, спачуваньні аўтара цалкам на баку прыгнечаных. Вобразы фабрыканта і тых, хто з ім, даны ў досыць адмоўным асьвятленьні, але і гэты радыкалізм Гаўптмана па сутнасьці рэакцыйны: ён адмаўляе капіталізм ня ў імя будучага, а ў імя мінулых, пройдзеных этапаў экаіамічнага разьвіцьця—з позыцый спачуваньня старому патрыярхальна-рамесьніцкаму ладу. Гаўптман спачувае рабочым, але адначасова ня верыць у рэальныя магчымасьці іх барацьбы. Праз усю п'есу вее адчуваньнем безнадзейнасьці, а можа і непатрэбнасьці гэтага паўстаньня.

Гаўптман сам адмаўляе наяўнасьць сацыяльна-палітычных тэндэнцый у гэтым творы. Вуснамі свайго адвакату ён заявіў у зьвязку з забаронай «Ткачоў» паліцыяй, што адзіным стымулам да напісаньня п'есы было для яго агульначалавечае пачуцьцё літасьці. Сьвядомае мастацкае вырашэньне сацыяльна-пал'тычнай задачы Гаўптман падмяніў у гэтай п'есе выяўленьнем свайго агульначалавечага пачуцьця літасьці і замілаваньня да пакрыўджанага і прыгнечанага брата, ізноў выяўляючы гэтым сваю сутнасьць дробна-буржуазнага мастака.

Натуралістычным стылем першай групы сваіх твораў Гаўптман абавязан моцным уплывам на яго з боку заснавальнікаў нямецкага натуралізму—Арно Гольца і Іоганэса Шлафа, вучням пасьлядоўным прыхільнікам якіх Гаўптман лічыў сябе ў пачатку сваёй творчай дзейнасьці. Недарма сваю першую п'есу—«Перад усходам сонца» ён прысьвяціў «Біярне П. Гольмсэну»—сумеснаму псэўдоніму Гольца і Шлафа.

[1]) Фр. Мэрынг «Мировая литература» і «Пролетариат» стар 311.

Адлюстроўваючы абкружаючую рэчаіснасьць ва ўсіх яе праявах, ён з бязьлітаснай праўдзівасьцю малюе яе адмоўныя бакі, імкнецца зразумець і ўскрыць прычыны адмоўных зьяў, не знаходзіць сілы, нават і ня робіць спробы змагацца супроць таго грамадзкага ладу, які іх параджае.

Гаўптман нядоўга ўтрымаўся на пазыцыях пасьлядоўнага натуралізму.

У адпаведнасьці з далейшым пераможным наступам прамысловага капіталізму і ўзмацненьнем сацыяльнага распаду дробнай буржуазіі, калі сярод прадстаўнікоў яе інтэлігенцыі юнчат ва была страчана надзея на выхад з замкнутага кола супярэчнасьцяй, Гаўптман робіць спробу адыйсьці ад жорсткай і бязьлітаснай рэальнай сапраўднасьці ў фантастычны сьвет ілюзорных блуканьняў.

У выніку гэтага адмаўленьня ад натуралістычнай, дакладнай і дакумэнтальнай фіксацыі няпрыглядных карцін канкрэтнай бытавой рэчаіснасьці, мы маем другую групу яго твораў, якая складаецца з сымболічных драматызаваных казак.

Зьяўленьне твору «Ганэлэ», у якім на агульным натуралістычным фоне ёсьць ужо ўсе адзнакі сымболізму, характэрнага ў далейшым для цэлага шэрагу наступных яго твораў, сьведчыла аб пераломе ў творчасьці Гаўптмана і выклікала моцнае зьдзіўленьне сярод тых колаў нямецкай грамадзкасьці, якія лічылі аўтара «Ткачоў» чалавекам, калі не рэвалюцыйным, дык ва ўсякім выпадку радыкальна настроеным. Соцыялістычныя колы ўпікалі Гаўптмана за тое, што ён зьвязаў нядолю пралетарскай дзяўчынкі з нейкімі рэлігійнымі марамі, з царкоўшчынай, з містычнымі ідэямі «загробного воздаяния».

Адмоўныя водгукі атрымала «Ганэлэ» і ад Фр. Мэрынга ,які згадзіўся ў сваёй ацэнцы гэтага твору са словамі аднаго з тагочасных крытыкаў аб «несымпатычным злучэньні царквы і тэатру, паталёгіі і сэрафічнага захапленьня».

На фоне бытавых натуралістычных дэталяй дому для бедных, галечы і жабрацтва, аўтар малюе выключна яркую, бязьлітасна моцную, чулую і псыхалёгічна глыбокую карціну прад сьмяротнага брэду пакрыўджанай, замардаванай, даведзенай за самагубства дзяўчынкі—дачкі каменшчыка. У гэтай містэрыі, якая увасабляе рэлігійныя мары і ўяўленьні паміраючага дзіцяці, Гаўптман сваімі надзвычайна моцнымі мастацкімі сродкамі сьцьвярджае ідэалістычную, папоўскую байку аб адвечнай вышэйшай справядлівасьці, аб непазьбежным пакараньні зла і ўзнагародзе за пакуты, і ў гэтым сэнсе адыгрывае аб'ектыўна рэакцыйную ролю. Недарма прыдворны пастар Фроммэль, які прагледзеў у якасьці цэнзара пастаноўку «Ганэлэ» у бэрлінскім каралеўскім тэатры, быў надзвычайна расчулены і поэтычна захоплены гэтым спэктаклем.

Да Märchendramen трэба акрамя «Ганэлэ» аднесьці «Потонувший колокол», «Бедны Генрых» і інш.

«Потонувший колокол» прасякнуты ўжо чыстым пасьлядоўным сымболізмам. У гэтай драматычнай казцы ідэёвы бок выяўлены вельмі слаба. Ён амаль цалкам затуляецца тонкімі і прыгожымі мастацкімі дэталямі. Але асноўны сэнс гэтага міталёгічнага паданьня пра вясковага майстра званоў Гэйнрызе, для нас зусім ясны.

Ідэалёгічная сутнасьць творчасьці Гаўптмана застаецца, ня гледзячы на зьмену формы, ранейшай. У аснове гэтай групы сымболічных твораў, далёкіх ад бязьлітаснай сапраўднасьці, паную тоесамае вострае адчуваньне канфлікту—распаду звычайнага і звыклага, трагэдыя адзінокага, адарванага ад сваіх устояў чалавека—дробна-буржуазнага гэроя, якое так характэрна для гэтага драматурга.

Нажаль мы яшчэ як сьлед не знаёмы з апошняй драмай «Перад заходам сонца» ,напісанай Гаўптманам не пасрэдна перад юбілеем. Сама назва гэтага твору быццам сымболізуе завяршэньне аўтарам апошняга кола яго драматургічнай творчасьці, распачатай больш як 40 год назад першай яго п'есай «Перад усходам сонца».

Ідэевы кірунак Гаўптмана застаўся нязьменны і ў гэтым апошнім творы, што пастаўлены да юбілею ў Бэрліне.

У аснове гэтай апошняй п'есы, таксама як і ва ўсіх папярэдніх—канфлікт асобы, у даным выпадку 70-ці гадовага буйнага капіталіста Клаўзэна, з абкружаючым асяродзьдзем. Канфлікт, які заканчваецца трагічнай гібельлю гэроя.

З цягам часу вонкавы і павярхоўны дробна-буржуазны радыкалізм і дэмакратызм Гаўптмана, характэрны для першых яго твораў, усё больш зьмяншаўся. У адпаведнасьці з гэтым расла яго слава сярод буржуазнай грамадзкасьці Нямеччыны. У часе імпэрыялістычнай вайны ён апынуўся ў лягеры буржуазных патрыётаў.

Гістарычнае значэньне сучасных падзей клясавай барацьбы засталося для яго незразумелым. На лістападаўскую рэвалюцыю 1918 г. у Нямеччыне ён не адгукнуўся.

Варта між іншым адзначыць, што на разасланую ўлетку г. г. анкету між народнага бюро рэвалюцыйнай літаратуры з запытаньнем пра тое, што ён будзе рабіць у выпадку імпэрыялістычнай інтэрвэнцыі супроць СССР, Гаўптман не адказаў.

Яго імя ня было і сярод такіх імён, як Джон Голсуорсі, Шарль Вільдрак і Стэфан Цвэйг, якія далі адказ на анкету, не гаворачы ўжо аб Ромэне Ролляне, Бэрнардзе Шоў, Тэодоры Дрэйзэры, Джоне Дас Пассос і інш., сумленна і адкрыта абвясьціўшых пра сваю гатоўнасьць да абароны СССР і барацьбы супроць імпэрыялізму.

Пазіцыя ігнараваньня адзначанай анкеты, занятая Гаўптманам, выклікала наступныя радкі адкрытага лісту, з якім зьвярнуліся да яго амэрыканскія пісьменьнікі і мастакі клюбу імя Джона Рыда, у часе нядаўняга прыезду Гаўптмана ў Амэрыку, сустрэўшы яго з вялікай урачыстасьцю:

«... Зрабіўшыся старэйшым, Вы страцілі гэта пачуцьцё (спачуваньня працоўным В. В.), а таксама і мінулую «проницательность»... Вы несьліся па плыні насустрач старасьці, поўнай ушанаваньнямі ,выпаўшымі на Вашу долю, дзякуючы той самай сыстэме, якую Вы гэтак гучна асудзілі адважным мастацтвам Вашай раньняй маладосьці. Старыя і стомленыя сацыял-дэмакраты аж па гэты дзень цешуць сябе ўспамінамі пра тую слаўтую ноч у «Нямецкім Тэатры», калі стары ваяўнічы Бэбэль падняўся і громкім голасам далучыўся да песьні ткачоў. Але гэтыя людзі з такім сэнтымэнтальным сумам глядзяць цяпер на свае ранейшыя дасягненьні, што адзін успамін пра гэты эпізод выклікае пад зрэньне ў моладзі, якая жыве ня ў сьвеце дзевяностых гадоў, а ў сьвеце, з якога зьняты ўсе «пакровы» сэнтымэнтальнасьці. Нас ніколькі ня цікавіць той факт, што кайзэр загадаў вынесьці з імпэратарскай ложы «Нямецкага Тэатру», свой герб, калі там былі пастаўлены «Ткачы». Нас не параўнальна больш цікавіць тое, што думае Герхарт Гаўптман зараз і што ён мае зрабіць для ткачоў 1932 г...

Часы «Ткачоў» яшчэ не прайшлі, альбо можа правільней было-б сказаць, што часы «Ткачоў» зьвярнуліся.

Эпос «Ткачоў» быў эпосам раньніх стадый капіталізму, калі буржуазія змагалася за уладу пры дапамозе крыві і поту, выцыснутага з земляробаў, якія ператварыліся ў пролетараў. Вы пражылі досыць доўга, каб убачыць гэты эпос адроджаным. Вы бачыце, як тая самая ненавісная кляса выцыскае кроў і пот з нашчадкаў сілезскіх ткачоў, аб якіх Вы калісьці пісалі...

Якую пазіцыю Вы займалі ў тых калесальных праблемах, што скалануць Вашу краіну? Ці не ўзьдзейнічала на Вашу душу мастака камэдыянства Гітлера? Ці ня думаеце Вы, што фашыстоўская сварка сымболізуе сабой выхад з становішча? Ці ня лічыце Вы, што працяг дыктатарскіх паўнамоцтваў ураду Гіндэнбурга, Брунінг дасьць хлеб галадаючым масам Нямеччыны?..

Гісторыя ня была на баку вашых ткачоў таму, што не наступіла яшчэ іх чарга, як клясы. Але цяпер надышоў канец царству ўсіх пагоншчыкаў рабоў.

Гісторыя цяпер выступіла на баку новага пакаленьня вашых ткачоў, якія жывуць у пэрыяд заняпаду, жорсткасьці і безсэнсоўнасьці сыстэмы, якая калісьці была вамі асуджана, але за раз, мусіць, вамі прынята...

Ваша доўгае служэньне справе мастацтва і ваш узрост наўрад ці могуць служыць вам апраўданьнем. Вялікія мастакі вашага пакаленьня, як напр., Горкі, Шоў, Ролян, і наш уласны Драйзэр, робяць тое, чаго не зрабілі вы. Яны працягваюць выкрываць усю жорсткасьць капіталізму. Яны протэстуюць супроць безчалавечнай эксплёатацыі чалавека чалавекам. Яны мужна падтрымліваюць новы парадак у яго барацьбе з старым.

Ці ня ў праве рэвалюцыйныя пісьменьнікі і мастакі вашай краіны, ўсё роўна як і ўвесь сьвет, чакаць, што ў гэтым крызісе гісторыі чалавецтва аўтар «Ткачоў» узьніме свой голас».

Гэрхарт Гаўптман свайго голасу ня ўзьняў.

На гэты ліст ён таксама не адгукнуўся ніводным словам.

І гэта робіць для нас у значнай частцы зразумелай тую афіцыйную ўрачыстасьць, з якой сьвяткуюць буржуазныя колы Нямеччыны 70-ці гадовы юбілей свайго «вялікага» Гаўптмана.

Леў Літвінаў

# БДзТ-1 у сэзоне 1932-1933 году

Сэзон 1932-33 году для БДзТ-1 праходзіць пад сьцягам творчай перабудовы ў першую чаргу, а таксама пад знакам перабудовы і паступовага вырашэньня праблемы кадраў (акторскіх, рэжысэрскіх, тэхнічных), тэхнічнага пераабсталяваньня тэатру, умацненьня яго тэатральнай базы.

Адначасова тэатр напруджана змагаецца за стварэньне арыгінальнага рэпэртуару, за ўмацаваньне творчай сувязі з пісьменьнікамі БССР, ня спыняючы работу над творамі савецкіх пісьменьнікаў братніх рэспубл'к і класыкаў.

1931 год зьявіўся годам, які сыгналізаваў тэатру пра неабходнасьць творчай перабудовы. «Справа гонару», «Шляхі-дарогі», «Лін'я агню»—спэктаклі, у якіх найбольш поўна вывявілася творчае раздарожжа, на якім тэатр апынуўся пад уплывам варожых тэндэнцый (паўзучы эмпірызм, пралеткультаўшчына, схэматызм, прым'тыўны фармалізм).

«Бацькаўшчына»

АКТ. Уладзімірскі ў ролі Леапольда ГУШКІ.

«Гута»—бясспрэчна, адзін з этапных спэктакляў БДзТ-1—хаваў у сабе натуралістычныя уплывы. БДзТ-1 шукаў выхаду да павышэньня культуры свайго майстэрства, да ўдасканаленьня свайго сьветапогляду

На шляху да гэтых пошукаў здаровага рэалізму БДзТ-1 і падпаў пад уплыў варожых плыняў.

1931 год быў, такім чынам, годам крызісу і росту. тэатр сышоў са старых пазыцый, на ўнага рэалізму, які мяжуе з натуралізмам і пачаў барацьбу за новы этап.

«Пляцдарм», «Лён»—першыя спэктаклі, дзе БДзТ-1 у пачатку 1932 году зноў становіцца (з памылкамі і зрывамі) на шлях барацьбы за стыль рэалізму. У гэтых спэктаклях (у кожным па-рознаму) ёсьць яшчэ рэцэдывы старых памылак (упрашчэнства, схематызм, натуралістычныя водгукі), як у апрацоўцы тэксту, а таксама і ў пастановачных плянах і ігры актораў. Але гэтыя спэктаклі падрыхтавалі глебу для пачатку сур'ёзных паглыбленных работ па творчай перабудове, па пошуках свайго стылёвага твару, па завастрэньні палітычнай накіраванасьці і павышэньні фармальнай тэакультуры.

Урэшце «Бацькаўшчына» зьяўляецца ў асноўным праграмным спэктаклем тэатру на бл'жэйшы пэрыяд. У «Бацькаўшчыне» знайшлі свой адбітак наступныя тэндэнцыі БДзТ-1:

БДзТ-1 трымае сталы курс на стварэньне арыгінальнай беларускай драматургіі. Тэатр вядзе паглыбленую работу разам з аўтарам, дамагаючыся высока якаснай п'есы, якою зьяўляецца «Бацькаўшчына». Для тэатру піша п'есу Андрэй Александровіч і заказана п'еса К. Чорнаму. З шэрагам пісьменьнікаў вядуцца перагаворы пра напісаньне п'ес. Тэатрам дадзены шэраг парад па пераробцы п'есы Барашк' «Романы Зора». Разам з тым, мы скарыстоўваем лепшае з твораў братніх рэспублік. Бліжэйшымі работамі зьявяцца: «Земля і неба» Тур, у пастаноўцы рэжысёра і актора БДзТ-1 тав. Зорава М. А., «Недаросль» Фанв'зіна, ў пастаноўцы рэжысёра і актора тэатру тав. Данілава П. А., у перакладзе Крапівы. Рэжысэр і актор тэатру тав. Рахленка працуе над канцэртам на тэму: «Старая і новая Беларусь». Да разработкі слоўнага матар'ялу для канцэрту будуць прыцягнуты шэраг беларускіх паэтаў і пісьменьн'каў.

У «Бацькаўшчыне» знайшлі месца шэраг элемэнтаў, якія зьяўляюцца з нашага пункту гледжаньня важнымі для выработкі канкрэтных асноў сацыялістычнага рэалізму.

Галоўнымі з 'х зьяўляюцца: вострая палітычная накіраванасьць спэктак-..., яго філёзофская паглыбленасьць, імкненьне да глыбокага і ўсебаковага псыхалёгічнага анал'зу вобразаў, барацьба са схэматызмам, шуканьне форм для перадачы рэвалюцыйнай рамантыкі падзей, імкненьне знайсьці адзінства тыповага і індывідуалізаванага ў падзеях і вобразах, пошукі арганічнай і вобразнай патэты кі без хатульнасьці і ілжэ-патасу.

Мы ў «Бацькаўшчыне» шукалі адзінства нацыянальнай формы і сацыялістычнага зьместу.

Мы, «Бацькаўшчынай», на чале з Кузьмой Чорным змагаемся за якасьць мовы ў нашых п'есах і ў тэатры, за лаканічнасьць формы, яе выразнасьць, сэнсавую, ідэёвую вастрату і жыцьцёвасьць, за павышэньне фармальнай і ідэёвай культуры актора і ўсяго тэатру цалкам.

Мы далей распрацоўваем і паглыбляем прынцып сынтэтычнага спэктаклю, дзе ўсе элемэнты (сьвятло, музыка, дэкарацыя) накіраваны на паглыбленьне і пашырэньне ідэёвага зьместу спэктаклю і ўзмацненьне яго эмоцыянальнага ўзьдзейнічаньня.

«Бацькаўшчына» ставіць перад тэатрам пытаньне пра сваечасовасьць пераходу да паглыбленьня паказу падзей не знадворнымі сцэнічнымі рухамі пры «обилии» масавых сцэн, а ўсебаковым дыялектычным аналізам псыха-ідэалёгіі асобных вобразаў, каб колькасьць людзей на сцэне не засланяла і не падмяняла якасьці ўскрыцьця асноўных вобразаў. Гэта не азначае адмаўленьня ад масавых сцэн, ад ўскрыцьця псыхолёгіі мас.

У «Бацькаўшчыне» мы абвясьцілі рашучую барацьбу рэштакам бытавізму, жанрызму ў творчым мэтадзе актораў БДзТ-1 і лічым, што дамагл'ся вялікіх вынікаў у гэтай цяжкай барацьбе, якая яшчэ ня скончана.

Час пакончыць з легендай пра тое, што, так называемая, «сцэнічная дынаміка» можа быць зьдзейсьнена выключна масавымі сцэнамі. Дынаміка псіхалёгічных, эмацыянальных узрушаньняў аднаго чалавека—сына клясы робіць ня меншае ўражаньне, а іншы раз і значна большае, чым дынаміка сцэнічных «мас», ад якіх мы ня думаем адмаўляцца наогул.

Акрамя таго, час сур'ёзна падумаць пра рост нашага актора, а на «масавых» сцэнах яго рост ідзе непамерна больш павольна, чым на п'есах тыпу «Егор Булычёв» альбо на вобразе Леапольда Гушкі, Паўла Няміры з «Бацькаўшчыны».

У сьвятле гэтага мы ў сучасны момант разам з К. Чорным перарабляем трэці і чацьверты акты «Бацькаўшчыны» (пішацца новы акт) і пераробляем афармленьне.

Актор БДзТ-1 якасна вырас.

Неабходна выразна адзначыць напружаную работу ўсяго калектыву тэатру над разработкай і здачай «Бацькаўшчыны». Акторскі склад тэатру з вял'кай энэргіяй узяўся за вучобу і за перабудову, за аваладаньне марксыцка-ленінскім сьветапоглядам і вынікі гэтай вучобы ўжо адчуваюцца ў «Бацькаўшчыне» у форме адыходу ў прыёмах ігры ад старых натуралістычных штампаў, павярхоўнага гротэску, бытавізму. Бязумоўна, гэта толькі пачатак перабудовы, у далейшым належыць зрабіць яшчэ значна больш.

Мы лічым, што «Бацькаўшчына», як спэктакль, мае патрэбы яшчэ ў рабоце над ім, неабходна вакол яго разгарнуць творчую дыскусыю, як ў самім тэатры, так і па-за тэатрам, каб падвесьці вынікі недахопаў і дасягненьняў работы.

На ўвесь рост паўстала ў гэтым сэзоне перад БДзТ-1 пытаньне кадраў—акторскіх, рэжысэрскіх, музычных і тэхнічных. За 10 год існаваньня кіраўніцтва БДзТ-1 увесь час бесклапотна адносілася да перавыхаваньня сваіх старых кадраў, да падрыхтоўкі зьмены.

У 1931 годзе тэатр апынуўся перад пагрозай вялікай перашкоды ў рабоце, дзякуючы адсутнасьці кадраў.

У мінулым годзе мы арганізавалі студыю, але з-за адсутнасьці сродкаў студыя існаваць не змагла. У сучасны момант у БДзТ-1 уліты на правах філіі першы калгасны тэатр. Такім чынам, у складзе БДзТ-1 ёсьць каля 30 маладых актораў.

Выхаваньне гэтай моладз'—першая ўмова далейшага росту. Вучоба пачалася, яе неабходна паглыбіць, пашырыць.

«Бацькаўшчына»

АКТ. Зораў у ролі Евеля ЦЫВІНА

Адначасова мы намячаем мерапрыемствы па перападрыхтоўцы старых кадраў тэатру.

Мы намячаем сыстэму запрашэньняў на цыкль лекцый буйных тэарэтыкаў і практыкаў савецкага тэатру з цэнтру (Захава, Маркаў, Навіцкі і інш.). Гэта, а таксама сыстэма навуковых камандыровак і творчых дыскусій унутры тэатру павінна зьяв'цца школай перападрыхтоўкі старых кадраў, акрамя пэдагагічнай работы пры пастаноўках новых п'ес.

Вялікую ролю ў выхаваньні актораў, у творчай перабудове ўсяго тэатру павінна і можа адыграць марксыцка-ленінская крытыка. Нажаль, наша тэакрытыка іншы раз ня толькі не зьяўляецца маркса-ленінскай, у шэрагу выпадкаў выказвае палітычнае вульгарызатарства і ўпрашчэнства, недахоп мастацкага густу, бязпрынцыповасьць і ярлыкаманію ў ацэнцы твораў, і г. д. напрыклад рэцэнзія Галуб'цкай пра «Бацькаўшчыну»). Нашы тэа-рэцэнзэнты часта пішуць пра тэатры і спэктаклі, ня ведаючы шляху таго, ці іншага тэатру. Яны (крытыкі) рэцэнзуюць ад выпадка да выпадку, не назіраючы за шэрагам зьяў у даным тэатры, ня маючы свай стрыжнёвай лініі у адносінах данага тэатру.

Калі ўзяць рэцэнзіі за 2-3 гады, то ніхто з рэцэнзуемых (тэатры, рэжысеры, акторы, мастакі, кампазытары) ня знойдуць выстарчальнай ацэнкі свайго шляху, акрамя агульных штампаваных сказаў. Некалькі лепш абслугоўваюцца аўтары. І зьдзіўляе тая лёгкасьць, той апломб, тая бясьпечнасьць, з якой многія з гэтых т. т. (Дорскі, Таўбэ, Галуб'цкая, Сабаленка і інш.) адным шырокім гэстам скідваюць 3-х-месячную работу цэлага калектыву, не даючы матываў, канчаткова, безапэляцыйна.

Адзін з асноўных мэтадаў выхаваньня актора, выпрацоўкі ў ім ўменьня аналізаваць сваю работу—творчыя дыскусіі, яшчэ не атрымалі патрэбнага разьвіцьця у БДзТ-1. Паасобныя гутаркі і абмеркаваньні работ (дыскусія пра «Бацькаўшчыну») маюць месца, але ад гэтага патрэбна перайсьці да сыстэмы дыскусій. Гэты прарыў неабходна ліквідаваць.

Трэба рашуча пакончыць з расхлябанасьцю ў справе перападрыхтоўкі і падрыхтоўкі кадраў. Мы пазначалі за апошні час падзеньне якасьці работы актораў, за некаторымі выключэньнямі у ЯДзТ- і БДзТ-2. Спатыкаючыся пры рабоце з вучнямі нашых драмкурсаў і драмтэхнікумаў, мы бачым, што і там неабходна палепшыць якасьць падработы.

Неабходна максымальная ўвага асноўнаму мастаку тэатру—актору, яго падрыхтоўцы і перападрыхтоўцы, яго творчасьці і, дарэчы, яго бытавым умовам.

Разам з гэтым хочацца выказаць скаргу на слабое прыцягненьне ў БССР пэдагогаў для тэатральных школ. Мы маем нікчэмную колькасьць пэдагогаў па пастаноўцы голасу, па фізычнай культуры, па гісторыі тэатру, па сацыялёгіі мастацтва і шэрагу іншых дысцыплін. Недахоп гэты рэзка адчуваецца на якасьці зьмены і трэба сваечасова заняцца прыцягненнем і падрыхтоўкай пэдагогаў.

Да работы ў БДзТ-1 прыцягнуты шэраг мастакоў: 1. Рабічоў («Лён», «Бацькаўшчына») М. Варпэх («Земля и неба»), вядуцца размовы з мастаком. М. Аксельродам па афармленьню «Недарасьля», а таксама з мастаком Тоўбіным-работнікам тэатру «Березіль» (УССР).

На парадку дню стаіць пытаньне пра прыцягненьне мастакоў БССР. БДзТ-1 шукае свайго мастака і яшчэ не знайшоў яго. Тэатр даў магчымасьць разьвіцьця аднаму з нашых таленав'тых кампазытараў Е. Цікоцкаму («Справа гонару», Пляцдарм», «Бацькаўшчына», «Земля і неба»), а таксама Туранкову («Лён»).

У Менску БДзТ-1 працуе да 15 сакавіка, да здачы «Зямлі и неба», «Недарасьля» і першай часткі канцэрту. Потым тэатр едзе на гастролі на Савецкі Ўсход: Ташкент, Самарканд, Ашхабад, Баку, Тыфліс, потым Данбас. Гэта падарожжа зьявіцца буйнейшай палітычнай падзеяй ў справе правядзеньня ленінскай нацыянальнай палітыкі, у справе абмену творчым вопытам братніх нацыянальных рэспублік. У дарозе БДзТ-1 мае ўзяць для пастаноўкі адну з лепшых п'ес рэпэртуару нашага Ўсходу. Далейшыя рэпэртуарныя пляны БДзТ-1 наступныя: п'есы арыгінальныя (Александровіч, Кобец, Галавач, Чорны), якія будуць падрыхтаваны да сярэдзіны году, пераклад з яўрэўскага Л. Рэзьніка «Так было»—з эпохі Н'калая І, «Юлі Цэзар», ці «Отэлло». Шэкспіра, п'еса пра Захад.

Работы шмат. Трэба сказаць, што і жаданьня работы, энтузіязму ў калектыве БДзТ-1 ня меней. У калектыве б'е струменем імкненьне да работы, да вучобы, ў гэтым парука росту.

Сэзон 1932-33 году—этапны, у гэты сэзон БДзТ-1 пав'нен разгарнуць яшчэ большую барацьбу за якасьць сваёй работы.

У барацьбе за ажыцьцяўленьне дырэктыў партыі мы ўжо дамагліся посьпехаў у рабоце, пад кіраўніцтвам партыі мы даб'емся тэатральных твораў вартых нашай эпохі.

«Бацькаўшчына», АКТ. І.

З чужаземнай паэзіі

ГЭНРЫ В. ЛОНГФЭЛО
Henry W. Longfellow

## СОН НЯВОЛЬНІКА
## Tne slave's Dream

Ляжаў ён паміж няпрыбранага рысу,
Ляжаў у самоце, з сярпом—
Голыя грудзі і валасы.
Засыпаны былі пяском.
У мглістым тумане апошняе мары
Ён бачыў радзіму сваю.
Праз краявід шырокі ў сьне
Цёк Нігэр па лагчынах,—
Ён там на волі зноў хадзіў,
Дзе пальмы на раўнінах
І слухаў караванаў звон
На чорных пуцявінах.
І чорнавокую жанчыну
Ён сьніў ізноў паміж дзяцей.
Яны туліліся імкліва
Да бацькавых грудзей,—
На твар скацілася сьлязіна
З павітых сном вачэй.
А потым з хуткасьцю шалёнай
Паўз Нігэр ён імчаў
І ланцугамі залатымі
Каня ён паганяў.
І чуў, як з кожным крокам гулка
І ваяўніча меч бранчаў.
Прад ім, нібы крывавы сьцяг
Плылі бліскучыя фламінгі,—
Да ночы з раньня ўсьлед за імі
Імчаўся ён між тамарындаў
Пакуль убачыў кафраў хаты
У акіяну берагі.
Лес мірыядам розных моў
Гучэў аб волі на зьмярканьні,
Пустэчы голас дзіка выў
У вольным парываньні,—
Ён толькі ўсьміхнуўся іх
Бурлівым адчуваньням.
Ён больш ня ўчуе пугі прыганятых,
Яго сьпіны ня будзе дзень паліць,
Бо сьмерць паходняй асьвятліла
Далёкіх мараў ніць.
Ляжыць ён між няпрыбранога рысу,
З сярпом ў руцэ ляжыць.

Пераклад з англійскае А. Мардвілкі.

## Габінэт ударніка

З 12 сьнежня пры Аргкамітэце Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў БССР адчынены Цэнтральны габінэт рабочых ударнікаў закліканых у літаратуру.

Габінэт ударнікаў зьяўляецца асяродкам марксыцка-ленінскай вучобы рабочых ударнікаў, калгасьнікаў, што заклікаваны ў літаратуру.

Габінэт ударнікаў дае ўсебаковую кансультацыю на творы маладых пісьменьнікаў, наладжвае лекцыі, каб дапамагчы рабочым ударнікам аўладаць тэхнікай літаратурнай справы.

У кансультацыі, дакладах, лекцыях прымаюць удзел лепшыя навуковыя работнікі, пісьменьнікі, паэты.

Габінэт ударніка дапамагае завадзкім літаратурным гурткам наладзіць літаратурна-масавую работу на фабрыках і заводах.

Кансультацыя даецца ў вуснай і пісьмовай форме на творы аўтароў, што пішуць на беларускай, яўрэйскай, польскай, літоўскай мове.

Аўтары з раёнаў могуць прысылаць свае творы і лісты на адрас: Менск, Савецкая 68, Дом Пісьменьніка, другі паверх, габінэт ударнікаў.

Для наведвальнікаў габінэт адчынены: 2, 6, 8, 10, 12, 16, 18, 20, 24, 26; 30 кожнага месяцу з 7-мі да 10 гадзін увечары.

## У Ленінградзе
### (Ад нашага спэцкарэспандэнта)

▲ У пачатку сьнежня ў г. Ленінградзе адбыўся агульны сход беларускай сэкцыі Ленінградзкага Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў.

Адказным сакратаром беларускай сэкцыі абраны Іл. Барашка.

У склад бюро сэкцыі ўвайшлі Іл. Барашка, Я. Бобрык і К. Губарэвіч.

▲ Выйшла з друку ў выданьні Ленгіхла аповесьць П. Броўкі «Каландры» у перакладзе на рускую мову.

▲ Па прапанове сэктару літаратуры народаў СССР Ленгіхлу, Іл. Барашка К. Губарэвіч падрыхтоўваюць калектыўны зборнік прозы для перакладу на рускую мову.

▲ Янка Бобрык працуе над паэмай «Горад Леніна».

▲ Беларуская сэкцыя Ленінградзкага Саюзу Савецкіх Пісьменьнікаў на працягу гэтае зімы арганізуе ў памяшканьні украінска-беларускага клюбу «Прасьвета» шэраг літаратурна-мастацкіх вечароў для беларускага студэнцтва і рабочых Ленінграду.

▲ У Дзяржаўнай Акадэміі Мастацтвазнаўства Янка Бобрык прачытаў даклад «Шляхі разьвіцьця беларускай савецкай кінематаграфіі».

▲ Беларуская сэкцыя ЛССП налічвае 14 членаў. Большасьць літаратурнага маладняку—студэнты розных ВНУ і тэхнікумаў Ленінграду.

▲ К. Губарэвіч напісаў новую аповесьць.

▲ У саюзе савецкіх пісьменьнікаў Ленінграду разгарнулася дыскусія па дакладу тав. Татарчанка «Аб крытэрыі мастацкасьці». Тав. Татарчанка у сваім дакладзе сьцьвярджаў, што мастацкім можа быць кожны твор мастацтва, нават і праніканёны непрадзівай ідэяй, калі твор правільна адлюстроўвае тыя альбо іншыя бакі сапраўднасьці, тым самым абвяргаючы птеха наўскі крытэрыі мастацкасьці, які вынікае з ступені адпаведнасьці формы і зьместу. Не адмаўляючы ролі сьветапогляду ў мастацкай творчасьці і важнасьці барацьбы за марксыцка-ленінскі сьветапогляд, неабходны і плённы для мастацкай творчасьці, тав. Татарчанка лічыць, што ступень мастацкасьці ў рэальнасьці і праўдзівых адносінах мастака да сучаснасьці. У дыскусіі па дакладу «Пра крытэрыі мастацкасьці» выступіў з надзвычайна цікавай прамовай праф. В. Дзесьніцкі, які абвінаваціў дакладчыка ў пераверзіянстве: «У прапанове дакладчыка—адсоўнуць сьветапогляд на другі план—мы маем супроцьстаўленьне навуковатэорытычнага і эстэтычнага мысьленьня. Між тым, перад намі стаіць задача—пабудовы матэрыялістычнай, дыялектычнай эстэтыкі»,—гаварыў праф. Дзесьніцкі.

У дыскусіі прымалі ўдзел А. Каменгулаў, Вінаградаў, Казакоў, і інш. Дыскусія «Пра крытэрыі мастацкасьці» зьяўляецца першай у пляне падрыхтоўкі пісьменьнікаў Ленінграду да Ўсесаюзнага зьезду.

▲ Юбілейная мастацкая выстаўка «Мастакі РСФСР за 15 год» карыстаецца надзвычайнай увагай працоўных Ленінграду. Выстаўка адчынена ў памяшканьні Рускага музэю.

## Папраўка

У мінулым нумары «ЛІМ» у артыкуле «Праблемы тэатральнай крытыкі» па віне карэктара ўкралася памылка ў абзацы: «З другога боку павінны быць рашуча адхілены, як шкодныя, настроі агульнага ахайваньня маладой тэакрытыкі і г д.».

Гэты абзац трэба чытаць наступным чынам: «З другога боку пав'нны быць рашуча адхілены, як шкодныя, настроі агульнага ахайваньня маладой тэакрытыкі, выказваньні, што крытычныя артыкулы пра пастаноўкі пішуць «каму ня лень», што аб'ектыўна накіравана на заціск самакрытыкі на тэатры, на згортваньне тэатральнай крытыкі, на запалохваньне новых растучых кадраў марксыцкай тэатральнай крытыкі».

У гэтым-жа артыкуле, у абзацы дзе ідзе гутарка пра рэцэнзіі Галубіцкай, таксама па віне карэктуры ў канцы абзацу, перад словамі—«Амаль нічога ня сказана пра работу актораў», выпала—«Недаацэнена работа рэжысэра».

Адказны радактар Х. ДУНЕЦ

РЭДКАЛЕГІЯ: А. Александровіч, Ахрэмчык, В. Вольскі, Галкін, І. Гурскі, Х. Дунец, М. Лынькоў, Модэль, С. Нортман, М. Рафальскі, А. Рымашэўскі, І. Харык, К. Чорны.

Выдае Дзяржаўнае Выдавецтва Беларусі.

Прымаецца падпіска на штомесячны часопіс

„Мастацтва і Рэвалюцыя“

Орган Наркамасьветы і ЦПС працмастацтва.

Выходзіць пад рэдакцыяй В. Вольскага.

Рэдколегія: Александровіч А., Гурскі І., Гурэцкі Я., Гітгарц І., Грубэ А., Гурчанка А., Гаўрыленка П., Модэль М., Платун А., Шамшур П.

Афармляе часопіс мастак А. ТЫЧЫНА.

Часопіс «М. і Р.» вядзе барацьбу за марксыцка-ленінскую мэтадолёгію ў мастацтве і мастацтвазнаўстве.

На сваіх старонках часопіс «М. і Р.» вядзе змаганьне за перабудову ўсёй работы мастацкага фронту БССР, адпаведна пастаноў ЦК УсеКП(б) і ЦК КП(б)Б пра перабудову літаратурна-мастацкіх арганізацый.

Часопіс «М. і Р.» шырока асьвятляе проблемы клясычнай спадчыны, а таксама сучаснае становішча мастацтва ў капіталістычных краінах.

Часопіс «М. і Р.» дапамагае работнікам тэатру, кіно, музыкі, скульптуры і выяўленчага мастацтва ў іх працы па стварэньню твораў, якія былі-б вострай зброяй, актыўным фактарам у барацьбе пролетарыяту за бяскласавае сацыялістычнае грамадзтва.

Часопіс «Мастацтва і Рэвалюцыя» шырока асьвятляе пытаньні самадзейнага мастацтва сучаснага савецкага тэатру, кіно, музыкі, скульптуры і выяўленчага мастацтва, — дае разгорнутую крытыку навейшых тэатральных пастановак, кіно-карцін, музычных твораў, малярства, скульптуры і графікі.

ЧАСОПІС БАГАТА ІЛЮСТРУЕЦЦА.

Падпісная плата:

На 3 м-цы 2 р. 25 к. На 6 м-цаў 4 р. 50 к. На 12 м-цаў 9 руб.

Цана асобнага нумару 75 кап.

СЬПЯШЫЦЕ ПАДПІСАЦЦА, ТЫРАЖ АБМЕЖАВАНЫ

Падпісацца можна на пошце, у агентаў па кнігараспаўсюджваньні, лістаносцаў.

ДзВБ

СЬЦЯПАН НОРТМАН

# Гаспадарча-разьліковая 4-й стужкі № 2

(Нарыс)

Бура - чырвонай сьцяною ўперлася фабрыка імя Дзяржынскага ў Сацыялістычную вуліцу. Уперлася адным закліпаным двухпавярховым памяшканьнем, асьветленым неспынна на працягу сутак. Удзень асьвятляе сонца, ўночы—электрычныя ліхтары і лямпы...

Праз адчыненыя сажэнныя вокны нязмоўна нясецца стук дзесяткаў швэйных машын.

Тук-тук--тук-тук-тук... тук... тук...

Удзень і ўночы вылётае праз вокны на вуліцу і на двор адпрацаванае паветра, удзень і ўночы струменіць сьвежага паветра з радасьцю паглынаецца грудзьмі. Вэнтылятары спынілі свой сьвіст, яны не спраўляюцца з на грузкай... і тому адпачываюць.

Пашлі ў водпуск...

Дзесяткі машынак манатонна адстукваюць, адчаканьваюць шрот, і з-пад лапкі ўецца, сьцелецца роўная, як струна, строчка...

Апранутыя ў белыя, шэрыя, яркажоўтыя блюзкі, у чорныя, сінія касачкі і белыя—апалы, людзі нагнуліся над крысамі, перакідаюць у руках кішэні, каўняры, дзе трэба па варачваць, разгладжваюць пашытыя, прасуюць і зноў накладваюць то доўгую, то кароткую строчку.

А пасярод пашывачнага цэху, за доўгім канвэерам працуе 16 чалавек. Яны аб'яднаны ў адно цэлае:

> **Гаспадарча-разьліковая брыгада т. Баршай, 4 й стужкі № 2.**

І сярод гэтых 16-ці—4 камсамольцы, адзін партыец.

Працуе брыгада над пашыўкаю пінжакоў.

Сярэдняга росту, чарнявы, з вачыма колеру вішні, якія то мягка-мягка ўхмыляючыся абдаюць сваім колерам, то сурова паглядаюць з пад насупленых броваў (гледзячы па абставінах) у чорнай рашпіленай касавароцы, з закасанымі рукавамі, схіліўшыся над машынаю, выводзячы роўную строчку, час ад часу падымае галаву і аглядае ўсіх; сочыць, ці не залішне ў каго работы, ці не сядзіць хто без працы, пакуль менш спрытны сусед, прарабіўшы сваю апэрацыю, не перадасьць па канвээры чаканае.

І заўважыўшы, што дзе-небудзь затормазілася—ён падымаецца і шпарка-шпарка падыходзіць, даведваецца пра прычыну і дае параду, як «нажаць» і дагнаць патрачаны, прамінуўшы час. Потым зноў садзіцца за машыну і зноў ўецца доўгая строчка, зноў выстуквае машына свой заўсёдашні шрот:

тук-тук, тук-тук, тук-тук-тук...

І так з дня на дзень зьбіраюцца за працай пяцідзёнкі, дэкады, месяцы, і сядзіць за работай т. Баршай.

II

Гэта было перад сьвятам 1 мая 1932 году. Брыгада Баршая, лічачыся ўдарнай, ня была гаспадарча-разьліковай, не выконвала вытворчых заданьняў.

Надыходзіла міжнароднае сьвята пралетарыяту. Усе рыхтаваліся яго сустрэць па-рознаму...

Як сустрэць сьвята—думаў і брыгадзір партыец Баршай. За працаю, у сталоўцы ў часе абеду, дома пасьля працы, з галавы ня выходзіла думка. Яна джаліла мозак, як авадзень, жужжэла ў галаве, не давала супакою.

Гэтая думка гаварыла, прымушала думаць, знаходзіць выхад:

Як выканаць прамфінплян?

Што зрабіць для гэтага?

І тады брыгадзір склікаў пасьля працы сход брыгады, на якім узьняў пытаньне:

> **Пра арганізацыю гаспадарча-разьліковай брыгады**

Былі спрэчкі, было ныцьцё—«і так, бач, працаваць можна», але ўсё-ж такі брыгада пастанавіла перайсьці на гаспадарчы разьлік. Пастанавіла і ўзяла на сябе шэраг канкрэтных абавязкаў:

Палепшыць якасьць прадукцыі.

Выканаць прамфінплян поўнасьцю.

Змагацца за ўжарганеньне сапраўднага гаспадарчага разьліку і 6-ці гістарычных умоў правадыра партыі і рабочае клясы т. Сталіна.

І першаю справаю было: расставіць сілы з такім разьлікам, каб узьняць прадукцыйнасьць працы, каб ня было затораў.

Для таго, каб пашыць пінжак—ён павінен прайсьці 16 апэрацый толькі па адной брыгадзе.

А пінжак выпадае на апэрацыі з кішэнямі абсалютнай шпаркасьці і дакладнасьці праверанаых рухаў, каб спраўляцца перадаваць далей па канвееры без затрыманьня. Ледзь зазяваўся працуючы над кішэнямі і.. за груз. Мала таго, што сам не ўправіўся, але яшчэ і суседа затрымаў, а той, у свой чарод, другога, і так да канца канвээра.

І на гэтую апэрацыю паставілі самага спрытнага з брыгады. І так, улічваючы кожную дробязь, растаўляючы свае сілы, каб пайсьці ў разгорнуты наступ на ворага, імя якому—недапрацоўка, няправільная арганізацыя працы і расстаноўка сіл.

Другім крокам была барацьба за якасьць. Сям-там ды зробіць хто небудзь брак. А на пераробку трэба на траціць каштоўны час. А час гэты не чакае. Ён, вылічваючыся ў хвілінах, складае гадзіны і дні. Міне час. А за часам трэба ўгнацца, падпарадкаваць сябе часу і час падпарадкаваць сабе, разьмеркаваць кожны рух па хвілінах і секундах.

Зьявіўся плакат.—«Ты працуеш ня ўважліва. Ты робіш брак. А брак—наша агульная бяда. Ты гэтым кладзеш пляму ня толькі на сябе, але і на ўсю брыгаду».

Седзячы пад такім плакатам ужо менш пазяхаеш, менш аглядаешся па баках, а ўважліва сочыш за строчкаю, уважлівей і акуратней прыкладаеш матэр'ял для прыстрочкі...

А зрабіўшага паўторна брак—выклікалі на агульны сход брыгады, дапамагалі пазбавіцца браку, давалі параду, бо кожны стаў хварэць за працу брыгады, за родную вытворчасьць.

Заключаны дагавор на сацыялістычнае спаборніцтва з брыгадай № 1 настойліва патрабаваў паскорыць тэмпы, настойліва патрабаваў узьняць прадукцыйнасьць і інтэнсыўнасьць працы да максімуму.

І раніцою, прыходзячы на працу, брыгада праводзіла 10—15-ціхвілінныя вытворчыя нарады, абмяркоўвала дзённае заданьне, высоўвала свае нормы, прыстасоўвала зьменна-сустрэчнае планаваньне з тым, каб да канца працы ўбачыць рэальнае у выкананьні сустрэчнага.

У выніку сацыялістычных мэтадаў працы, да канца месяца пры падсумаваньні вынікаў аказалася:

Прамфінплян выкананы на 100,9 процантаў.

Заработак узрос з 70—80 рублёў да 100—120 р.

А калі-б не затрымлівалі прасто па тэхнічных умовах (адсутнасьць электраэнэргіі) і не перашкаджаў брак па віне закройнага цэху, дык вынікі аказаліся-б яшчэ лепшымі.

Недахоп у брыгадзе—гэта адсутнасьць тэхнічнай вучобы. Для зьнішчэньня гэтага арганізоўваецца гурток тэхнічных ведаў, пры аўладаньні якімі брыгада здолее выйсьці ў першыя шэрагі ўдарнікаў сацыялістычнай працы.

Калі ў канцы месяца брыгада падсумоўвала вынікі сваёй працы, дык запісала:

«Сярод нас 2 неўдарнікі. Гэта тыя, хто робіць часам брак, тыя, хто ня здолеў падпарадкаваць сабе часу, хто затрымлівае працу».

III

Па тратуары праходзяць людзі. Адны сьпяшаюцца, другія ідуць паважнай хадою. Але і тыя і другія, праходзячы паўз бура-чырвоны корпус швэйнай фабрыкі, заглядваюць у адчыненыя сажэнныя вокны, адкуль выкідаецца адпрацаванае паветра, адкуль чуецца манатонны, часам узрастаючы, падобны да кулямётнай страляніны, стук швэйных машын:

Тук-тук... тук... тук... тук... тук...

За доўгім канвээрам сядзяць людзі, націскаюць пэдалі машыны, аўтаматычны электраўключальнік, і з-пад іголкі, з-пад лапкі кладзецца то роўная, як струна, то-крывая, як сьцежка, строчка.

Па канвээры рухаюцца пінжакі і штаны, каб трапіць на склад, адкуль—у краму і да спажыўца...

г. БАБРУЙСК.

Менск, друкарня імя Сталіна

Галоўлітбел № 618—А